Дажынкі ў Залуках ☞ 4

Ніва

ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ

PL ISSN 0546-1960 NR INDEKSU 366714

Вяселле ў Гайнаўцы ☞ 8

http://niva.iig.pl

redakcja@niva.iig.pl

№ 38 (2888) Год LVI | Беласток, 18 верасня 2011 г. | Цана 2,50 зл. (у тым VAT 5%)

Тэкст і фота Ганны КАНДРАЦЮК

Хіба нашыя такое маглі зрабіць?

Адразу пасля прыезду з Орлі я трапіла на беластоцкі марш еднасці супраць актаў неталерантнасці і нянавісці. Там у жывую пабачыла маладзёнаў, якія раўлі фашысцкія лозунгі: *Cała Polska dla Polaków! Nie przepraszam za Jedwabne! Polska cała tylko biała!*

Ад іх агрэсіўнага гыркату спачатку шорхла цела. Шакіравала іхняя адкрытасць. З'явіліся ў белы дзень, з адкрытымі тварамі, з вачыма палаючымі агрэсіяй. У час калі паліцыя лавіла „герояў" нядаўніх фашысцкіх інцыдэнтаў у Ядвабным і Орлі.

Сутыкнуўшыся твар у твар з агрэсіўнай гайнёй, я старалася запамятаць іх твары. Без поспеху. Яны ўсе зліваліся ў адну чорную „хмару", з якой, здавалася, за момант пасыплецца град. Пасля ў іх адрас паляцелі насмешкі. Найбольш адважна паводзілі сябе стрэйшыя цёткі. Яны ад хвалявання размахвалі ружамі падаравамымі арганізатарамі маршу і, як добрыя мацеркі, прамаўлялі да чорнага сумлення лысуноў:

— *Kto was tak wychował? Smarkacze! Kto tak wszystkich na łyso ostrzygł? Żeby choć na jeżyka wam włosy zostawili! Do szkoły albo do Afganistanu!*

* * *

Менавіта, той марш спачатку выглядаў як беластоцкае няшчасце. Асабліва, калі лысая групоўка апярэдзіла калону мірных удзельнікаў маршу і „павяла" ўсіх цэнтрам горада пад помнік Заменгофа. Людзі, якія сядзелі ў піўных агародчыках, з цікаўнасцю глядзелі на закалот. Ніхто з іх не падняўся з крэсла і не пайшоў разам прадэманстраваць абурэнне за Ядвабнае. Прыгадайма: там на помніку ў памяць яўрэяў спаленых у гумне хтось нашмараваў свастыкі і надпісы: *Nie przepraszam za Jedwabne — Byli łatwopalni.*

У беластоцкім маршы, на першы погляд, немагчыма было разабрацца ў чым справа. Хто тут фашыст — хто мірны дэманстрант? Ці можа крочаць усе фанаты футбольнага клуба „Ягелёнія"?! За гарлапанячай групай ішоў прэзідэнт горада, які раней публічна фатаграфаваўся з заўзятарамі названага спортклуба. Тут жа ішлі і кандыдаты ў дэпутаты і сенатары, дзеячы няўрадавых арганізацыяў, палітыкі, журналісты, людзі з дзеткамі ў калясках. Я малілася, каб лысуны не пацягнулі за сабой шэсця ў бок вуліцы Ліповай. Там якраз у выніку рамонту дарогі сарвалі брук і паскідалі ў гурбы каменне, якое быццам і чакала падобнай нагоды. На шчасце, абышлося без крыві. Калі лысую кампанію пачала здымаць на камеру паліцыя ў цывільным, тыя адразу разгубіліся і абселі. Іх крык страціў яд. Ды і яны самі, як звярына ў час атакі, сфармаваліся ў цесны круг ды пазахілялі туды лысыя галовы, пакідаючы на пагібель свае азадкі і спіны. Каб адысці з сякім-такім гонарам (іх першы лозунг: Bóg, Honor, Ojczyzna) загаласілі яшчэ на развітане: *Ten marsz był nasz! Ten marsz był nasz!*

У іх след пасыпаліся бравы. Для чалавека звонку цяжка было разабрацца: ці „віншуюць" паплечнікі, ці іншадумцы?!

* * *

На беластоцкім маршы найбольш уразіла жывое абурэнне цётак, якім не спадабаўся лысы фрыз у юнакоў. Падобна ўзрушылі мяне людзі з Орлі, якія на пытанне, што думаюць пра аўтараў фашысцкіх надпісаў на іх сінагозе, адказалі як прыстоіць на Падляшшы:

— *А коб ім лапы поўсыхалі!*

Орлю наведала я ў той самы дзень, у поўдзень, 4 верасня г.г., разам з сябрамі аб'яднання АБ-БА, якія прыехалі са спектаклем „Ой, даўно, даўно". Пастаноўку паказалі ў апусцелай сінагозе. Месяц таму будынак абшмаравалі надпісамі: *Żydzi do gazu, Jude Raus, Cała Polska dla Polaków, White Power.* Месцы пасля лозунгаў зараз заклеены свежым тынкам.

— *Мне і мешканьцом Орлі е вэльмі пшыкро,* — кажа Пётр Сельвясюк, войт Арлянскай гміны, які з сямейкай прыехаў на спектакль. — Нашы людзі ў нічым тут невінаваты. Ніколі раней у нас не было такога здарэння. Ну, але пачакаем вынікаў следства, якое зараз вядзе паліцыя. Тады ўсё будзе ясна.

Каб хутчэй злавіць віноўніка, войт назначыў сваю ўзнагароду — тысячу злотых. У апошнім рашэнні ёсць надзея на поспех, — у мясціне ўжо даўно „злавілі" віноўніка.

Я сама, з маршу, даведалася больш, чым хацела...

* * *

Яшчэ да спектакля я пайшла ў народ распытацца пра надпісы на сінагозе. Каля царквы гутарылі пра акцёраў пастаноўкі: „Ой, даўно, даўно":

— *А то жыды ці палякі?* — спытала старажылка ў сваёй каляжанкі.

— *Не, руські...*

Той дыялог рассмяшыў мяне, паколькі хвілін пяць да іх размовы сам настаяцель запрашаў прыхаджан на беларускі спектакль, дзе, як адзначыў з націскам: прагучаць праўдзівыя гісторыі пра жыццё, на нашай роднай мове.

Гэты прыгожы заклік святар выказаў па-руску.

Пра надпісы на сінагозе старажылкі не чулі.

— Спытайцеся ў тых што каля *гасподы,* — параілі мне, — яны ўсё ведаюць і знаюць. Хто куды пайшоў — хто з кім падзерся...

У парку ля *гасподы* ўсе лавачкі былі заняты мужыкамі, яны гаманілі сабе на сакавітай беларушчыне, густа перапляцаючы яе матам. Мне было няёмка падысці і проста з маршу распытаць пра фашысцкія надпісы. Справа, усё ж, далікатная. Таму спачатку я заглянула ў сярэдзіну *гасподы*, каб прывітацца са знаёмай барменкай. Адразу маім следам прыпёрся кавалер, якія выседжваў на той жа лавачцы, і зараз з'явіўся быццам на разведку. Ён бесцырымонна прысеўся да майго крэсла і прапанаваў: Może ty kawę wypijesz?

Калі я падзякавала на мясцовым дыялекце, „разведчык", адскочыў як апараны варам:

— А ёп... ма.ь! — выгукнуў ён з радасцю. — А мы, думалі што ты жыдоўка!

— А што, то жыдоўка горшая? — пацягнула я тэму.

— Не, не. Так падумаў, бо чорная...

У справе паганых надпісаў Орля падзеленая на дзве фракцыі. Паводле адных, надпісы зрабілі чужыя, трыццацігадовыя веласіпедысты, мужчынскага полу, якія адвячоркам завіталі пад сінагогу, а пасля падаліся ў напрамку Рудутаў.

— Але я ў гэта не веру, — сумняваецца мой субяседнік. — Хто табе роварам будзе валачыць банькі з чырвонай фарбай? Гэта нязручна. І за старыя яны на такую „забаву".

— Я таксама не веру ў гэтую версію, — адказала я, — як жа яны на тых веласіпедах уцяклі б ад паліцыі?

На момант у *гасподзе* запанавала магільная ціш.

— Найхутчэй гэта наша *вашабойня* зрабіла! — сказаў сціпшана мой „разведчык".

— А ці ў вас няма канфліктаў паміж палякамі і беларусамі? — працягвала я. Падобныя акты нянавісці ў адрас жыдоў часта выспяваюць на другім уражлівым грунце, напрыклад нянавісці да іншаверцаў або сексуальных меншасцяў. Такі Беласток, пра што ўжо абрыдла пісаць, вышмараваны ад Дайлідаў па Страсельцы маленькімі і вялікімі свастыкамі ды лозунгамі: *Ruskie won!*

— Нашы палякі такія самыя як мы — тут мой субяседнік пералічыў імёны калегаў — яны такога не маглі зрабіць, бо самі па-польску не ўмеюць гаварыць. Як паедуць у Польшу, то іх *кацапамі і руськімі* абзываюць.

— Гэта зрабілі прыезджыя з другога горада, — кажа ў абарону жыхароў Орлі чарговы ананімшчык з *гасподы.* — Нашыя не маглі бы такога зрабіць!

— А што з гэтай *вашабойняй* ?

— Яны, тым больш, не маглі гэтага зрабіць. Чаму пытаеце? Бо нашыя такой мовай пісаць не ўмеюць. А што тое „White Power" значыць?!

9 770546 196000

Лекі і самалячэнне

Калі чалавек занямог, то, зразумела, ён пачынае ўжываць лекі. Калі занемагла краіна, то варта, хіба, зрабіць тое самае. Але вось праблема — важным ёсць правільна паставіць дыягназ, каб можна было набыць сапраўды неабходны лек які дапаможа. Бо практыкаванне не таго лячэння, якое трэба, можа не толькі пагоршыць сітуацыю, але і прывесці да непапраўных наступстваў.

Спачатку пра людзей. У Беларусі заяўлена, што ў хуткім часе вялікую частку лекаў, якія раней ў аптэках прадаваліся вольна, можна будзе набыць толькі па рэцэпце доктара. Маўляў, няма чаго займацца самалячэннем. Тут патрэбна рашэнне спецыялістаў.

Зразумела, што на аўтарытэт спецыялістаў ад медыцыны ніхто не пасягае, не пасягаў і не збіраецца. Калі гаварыць як ёсць насамрэч, то і раней, многія медыцынскія прэпараты ў Беларусі прадаваліся выключна па рэцэптах, выпісаных у паліклініцы або шпіталі. Але ж ёсць прышчы, якімі дурыць галаву спецыялісту не толькі непатрэбна, але і сорамна. Тым не менш, зараз заяўлена, што 95 адсоткаў тых надзеяў на палёгку будзе рэалізоўвацца выключна па рэцэптах медыцынскіх устаноў. І ўсё гэта нібыта з найгуманнейшай мэтай, якая мусіць адвучыць беларусаў ад самалячэння. Як гаворыцца, усялякую справу можна давесці да абсурду. Але нам тут не прывыкаць. Не першы раз.

Праўда, не ўсе людзі паверылі ў шляхетныя памкненні тых чыноўнікаў, якія дадумаліся да такога ўскладнення набыцця лекаў. Справа ў тым, што лекі, прынамсі вялікая іх частка, купляюцца за мяжой і за валюту. Беларускі рубель валютай не з'яўляецца. А з іншымі банкаўскімі купюрамі, якія лічацца канверціруемымі, у краіне невялічкая напруга. Невялічкая, гэта мякка кажучы. Вось хіба што і надумаліся зберагчы валюту такім чынам. Ці з'явіцца ад гэтага валюта ў краіне пакуль невядома, а вось у народа ўжо з'явілася новая прымаўка: — „Здароўе за рублі не купіш".

І вось цяпер, пры кожным дробным недамаганні, з якім чалавек дваццаць першага стагоддзя сам павінен ведаць як справіцца, трэба ісці да лекара. А да яго хадзіць па рэцэпт не толькі не хочацца, але і небяспечна. Бо з надыходам грыпу і іншых эпідэмій, што перадаюцца паветрана-кропельным шляхам, у доўгіх чэргах да беларускіх дактароў заразіцца гэтымі хваробамі прасцей чым у прабірцы з мікробамі. А пасля яшчэ выпадае прывалачы гэтыя вірусы ды бактэрыі дахаты. Ды ўвогуле ў тых чэргах да беларускага лекара памерці можна хутчэй, чым убачыш таго чалавека ў белым халаце. Таму грамадзянін краіны з унікальным шляхам развіцця будзе цярпець боль і нязручнасць, але да доктара не пойдзе. Таму і лекаў ён не набудзе. А для ўнікальнай сістэмы эканомікі зберажэ такую неабходную валюту.

Цяпер пра дзяржаву. Яе кіраўніцтва адсутнасць валюты не называе крызісам. І пазыкі, якія вісяць на будучых пакаленнях таксама так не называе. І рэцэптаў на лячэнне эканамічнай сітуацыі ні ў каго браць не збіраецца. Ні на Усходзе, дзе могуць падтрымліваць хваробу беларускай эканомікі ў хранічным стане на пэўных умовах, ні на Захадзе, дзе, як паказала жыццё і развіццё, дыягназы выхаду з крызісу ставіць умеюць. І эканамічныя хваробы лячыць таксама.

Толькі вось бяда, не падабаецца нашым чыноўнікам тое, што ў рэцэпце іхных заходніх спецыялістаў напісана. Маўляў, не трэба нам ніякіх умоваў выстаўляць палітычнага характару. Бо хваробу мы хочам вылечыць эканамічную. А палітычную сістэму збіраемся пакінуць без зменаў.

Што тут скажаш. Відаць беларускія лекары ад эканомікі не ведаюць галоўнага правіла. Калі лечыцца хвароба, то трэба шукаць яе прычыны. Бо ў арганізме дзяржавы, як і ў чалавека, усё ўзаемазвязана. І гэта таксама эканамічны закон, што калі апазіцыйныя лідары ды кандыдаты на галоўную пасаду краіны, і нават праваабаронцы знаходзяцца ў няволі, то і са звычайнымі лекамі, як і з іншымі рэчамі, пачынаюцца праблемы.

Толькі вось у гэтым выпадку, чамусьці, беларускімі спецыялістамі ад эканомікі абраны шлях на самалячэнне.

Віктар САЗОНАЎ

Уклад у гісторыю

Бард, як гэта сёння разумеем, гэта творца незалежны перш за ўсё ад афіцыйнай плыні культуры, але і ад камерцыйных бліскотак. Гэта ўвасоблены голас ціхай большасці і не так бунту, як чалавечага супраціву ў адносінах да нейкай запляснелай, крывадушнай рэчаіснасці. Такім бардам, і хіба апошнім бардам у Польшчы, быў Яцак Качмарскі. У рэаліях новага дзяржаўнага ладу, калі высахлі атручаныя крыніцы падмацоўваючыя паставы ідэйнага нонканфармізму ці палітычнага супраціву, бардаўскі рух камерцыялізаваўся і хіба так лепш, чым меў бы надалей развівацца, надалей знаходзячы сабе падкормку гневу і нязгоды на ідэалагічны дурман. Вядома, нонканфармістаў ці бунтароў у Польшчы да сёння дастаткова, ды скажам сабе шчыра, калі захаваюць яны пазіцыю супраціву, дык адносна формаў, якіх на розных узроўнях набіраецца сучасная цывілізацыя, а не іх зместу. Бо тыя ў новай рэальнасці сталі аднолькава расплыўныя і нявызначаныя, як субкультурныя праявы бунту ў адносінах да іх, якія нарэдка праяўляюцца ў татуіроўцы на скуры або генерацыйнай агрэсіі ў адносінах да ўсяго і ўсіх.

На жаль, у Беларусі аспрэчваючы рух, між іншым і бардаўскі, квітнее і не толькі ў палітычнай, але і культурнай сферы. Дарэчы, абедзве гэтыя сферы, з-за заціскаючайся пятлі, накінутай на беларускі народ спадаром Лукашэнкам пры дапамозе ягонай кампаніі, узаемна пранікаюцца. Абарона нацыянальных каштоўнасцей, беларускай культуры і мовы, нішчаных лукашэнкаўскім рэжымам, стала палітычным пытаннем. Абарона права на палітычныя погляды нязгодныя з афіцыйнымі стала заадно рацыяй супраціву ў адносінах да тае, якой садзейнічае дыктатура — тае з палітычнага скансэну, і заадно грамадзянскім забавязаннем да стварання культурнай разнароднасці, якая ў сваёй дынамічнай зменлівасці запабягае мумі-фікацыі народа.

Не без прычыны трох беларускіх бардаў — Віктар Шалкевіч, Андрэй Мельнікаў і Зміцер Вайцюшкевіч рашылі запісаць па-беларуску 18 твораў Яцка Качмарскага, між іншым славутыя „Муры". За іх абеларушванне ўзяўся Андрэй Хадановіч, паэт і перакладчык м.інш. паэзіі Чэслава Мілаша — польскага ліцвіна або ліцвінскага паляка.

Аб Віктары Шалкевічу ведаю, што ён беларускі паляк ці польскі беларус, што не значыць, што не можа ён быць адначасова беларусам і палякам. Аб двух іншых бардах магу сказаць няшмат апрача таго, што яны знакамітыя песняры, прычым Змітра Вайцюшкевіча часта можна сустрэць у Чаромсе, падляшскай вёсцы славутай мульцікультурным фестывалем і яго поўнымі творчага шаленства аніматарамі, дзе Зміцер з поспехам дае канцэрты. Дарэчы, цікавая катэгорыя — беларускі паляк ці польскі беларус. Варта было б узяцца за дэфініцыю. Бо хоць у абодвух выпадках такія асобы растуць з маленства і ў мове, і ў культуры быццам бы чужой стыхіі, дык якраз таму чужымі ў адносінах да таго мачашынага ім па-нацянальнасці духа быць не могуць. Хочуць таго ці не, праз тую дваістасць сублімуецца ў іх новая ментальная якасць — чалавек пагранічча культур — з незвычайна творчым патэнцыялам. Прыкладаў такой сублімацыі ў абшары шырока ўспрыманага пагранічча: беларуска-польска-літоўска-ўкраінска-яўрэйскага можна было пералічваць тысячы. Цікава тое, што гэтага аспекту здаюцца не прыкмячаць гісторыкі.

Нядаўна прачытаў я падручнікавую гісторыю Беларусі аўтарства Яўгена Міраноўіча і Алега Латышонка. І перажыў шок. Абсалютна нішто мне з нічым не сутыкалася. Не гаварыўшы ўжо пра асабістае і саромячае мяне невуцтва на тэму гісторыі Беларусі, паказвае гэта яго сапраўдную генеалогію — аб суседзях Польшчы падручнікі па гісторыі вучаць польскую моладзь мімаходзь, абы-як, без пранікліваго аналізу. Быццам бы гэта нармальна, што тое, што важнае для гісторыка-беларуса, часта апускаецца гісторыкам-палякам. І наадварот. Хопіць адкрыць падручнік абавязваючы ў Польшчы ці ў Беларусі, каб са здзіўленнем сцвердзіць, што вялікія пачыны суседа разглядаюцца ў катэгорыі перыферыйнага здарэння, а ягоная шматвяковая гісторыя ахопліваецца ў кароткім абзацы паміж апісаннем чарговай вайны і чарговай палітычнай ці гаспадарчай узурпацыі варожых сіл. Але так яно ёсць і з падручнікамі абавязваючымі ў іншых краінах. Толькі ці можна ў такі спосаб спазнаць і зразумець узаемныя рэ- і сентыменты суседзяў? Ці толькі такім чынам можна навучыцца „гістарычнай" пакоры ў адносінах адны да адных? Ці не час разбурыць муры? А пакуль што, чакаем дыску Качмарскага ў выкананні бардаў Беларусі, а перш за ўсё гэтых слоў заспяваных па-беларуску: „А мур разваліцца..." І гэта будзе важны ўклад у супольную гісторыю.

Міраслаў ГРЫКА

Вачыма еўрапейца

Пасля Маршу еднасці

На месцы паліцыянты не інтэрвеніявалі, бо не атрымалі ніякага паведамлення аб падазрэнні злачынства і ніхто не стаў ахвярай. Уся сітуацыя, аднак, была манітараваная паліцыянтамі, — так сказаў пасля таго, як група каля сарака кароткастрыжаных маладых людзей у нядзелю (4 верасня) уздымала ў час маршу еднасці і талерантнасці ў Беластоку лозунгі тыпу: „Wielka Polska narodowa", „Polska cała tylko biała", „Nie przepraszam za Jedwabne", „Naszą bronią nacjonalizm". У гэтым парушваным каля двухсотасабовым маршы ўдзельнічалі м.інш. дэпутаты і самаўраднікі Грамадзянскай платформы, з дэпутатам Робертам Тышкевічам, сенатар Владзімеж Цімашэвіч, прадстаўнікі няўрадавых арганізацый і нацыянальных меншасцей. Быў ён супрацівам ў адносінах да змасаваных у апошні час праяваў ксенафобіі і расізму, якія мелі месца ў Крынках, Орлі, Пунску, Ядвабным і Беластоку (успамінаў я пра іх тыдзень таму).

Марш выйшаў з-пад помніка маршалку Юзафу Пілсудскаму пад помнік Людвіку Заменгофу („лысуны" ўвесь час ішлі побач, пасля — за ўдзельнікамі маршу). Паліцыя і гарадская страж прыглядваліся пасіўна. Прэзідэнт Беластока Тадэвуш Трускаляскі пасля маршу, распытваны журналістамі чаму паліцыя не інтэрвеніявала, заявіў, што паліцыя — дзяржаўная (значыць, яму не падлягае), але напэўна наступствы будуць прыняты, а горад абмяркуе выступленне за дэлегалізацыю арганізацыі, наконт якой падазраецца, што гэта яе члены выкрыквалі і прабавалі парушыць спакой мірнай дэманстрацыі.

Дзень пасля маршу прэзідэнт і ваявода Мацей Жыўна патрабавалі тлумачэнняў ад гарадскога каменданта паліцыі, а Роберт Тышкевіч звярнуўся да ваяводскага каменданта з г.зв. дэпутацкай інтэрвенцыяй у справе бясчыннасці паліцыі. Адначасова ваяводскі камендант паліцыі Ігар Парфенюк заявіў журналістам:

— Мы ідэнтыфікавалі 23 асобы і падалі заявы на іх пакаранне. Аб пакарнні вырашыць суд.

У сваю чаргу Ірэна Дарашкевіч, гарадская камендантка паліцыі, выявіла СМІ, што частка парушаючых марш паказвалася ўжо раней у паліцыйных матэрыялах і вядзецца праверка, ці яны з'яўляюцца членамі якойсь арганізацыі. Таксама ў панядзелак ваявода Мацей Жыўна і камендант паліцыі сустрэліся з прадстаўнікамі нацыянальных меншасцей, пражываючых на Падляшшы. Прагучала м.інш. абяцанне склікання групы складзенай з прадстаўнікоў меншасцей, якая мела б быць супольным голасам супраць праяў дыскрымінацыі, між іншым мела б апрацаваць напр. адпаведныя праграмы грамадска-медыйнай адукацыйнай кампаніі для пачатковых, гімназічных і звышгімназічных школ.

У чацвер прэзідэнт Трускаляскі прадставіў заклік да вучняў і педагогаў беластоцкіх школ. Напісаў у ім, спасылаючыся на ўсе расісцкія і ксенафабічныя інцыдэнты з апошняга часу: „Наша абурэнне гэта замала. Мусім рашуча выказвацца ў абароне традыцый польскай шматкультурнасці. Наша абыякавасць ці толькі пасіўнасць гэта дазвол на чарговыя дзеянні асоб, якія са сваёй ксенафобіі хочуць зрабіць грамадскую норму". Заклік прэзідэнта поўны патэтычнасці і хвалюючы. Але ў час гэтай самай прэс-канферэнцыі ў час якой прэзідэнт прадставіў гэты заклік, на пытанні журналістаў адказваў:

— На маршы я быў прыватна.. Я не кірую паліцыяй. Не ведаю, ці было б лепш, калі б паліцыя рэагавала. Можа, калі б адгарадзіла крычаўшых яшчэ пад помнікам Юзафу Пілсудскаму, абышлося б без эскалацыі.

Без каментара.

Мацей ХАЛАДОЎСКІ

Меў быць Парыж

Тэкст і фота Аляксандра ВЯРБІЦКАГА

З „ваяжорнага” аўтобуса злажу ў Скіндзеры. А там размах дарожных работ на ўсёй даўжыні вясковай вуліцы. Рух машын адбываецца сімплексна, напераменна. А рух там буйнаваты, гэта ж шаша паміж Беластокам і Аўгустовам, якая мае злучаць дзве еўрамагістралі: „балтыйскую” з „карпацкай”. Аднак разбудова дарогі не надта размашыстая, яна вёскі не мінае, адно толькі на дарожным палатне з’яўляюцца астраўкі для пешаходных пераходаў і размежавальныя палосы на згібах шашы паміж супрацьбежнымі паясамі руху; Еўропа дабіраецца ў свой цэнтр надта памяркоўна. За Скіндзерам шаша захоўвае сваё дагэтуляшняе тутэйшае аблічча.

Даходжу да суседняй у напрамку Сухаволі вёскі, якая зараз называецца Дрыгай. Ян Гузоўскі, аўтар выпушчанай у 2000 годзе кніжачкі па гісторыі Сухавольскай гміны, так піша пра этымалогію назвы гэтай вёскі: „Nazwa wsi Dryga pochodzi od nazwy sieci rybackiej [dryga, трыгубіца — А.В.], (...) które tu wiązano i używano lub tylko składowano.” Аднак гэты ход думак спадара Гузоўскага можна ўзбагаціць іншым этымалагічным меркаваннем, узятым ад Зыгмунта Глогера: „Drygant, dryś, tak nazywano dawniej ogiera, stadnika. (...) Najdosadniej wyraża się „Lekarstwo na uzdrowienie Rzeczypospolitej” (r. 1649) w słowach: „Kazałbym takowe dryganty, co około cudzych żon rżają, powałaszyć”. Karłowicz twierdzi, że wyraz drygant jest rdzennie polskim i pochodzi od słowa: drygać, podrygiwać.” Клопат толькі ў тым, што гэтая вёска раней называлася крыху інакш, бо ў XVIII стагоддзі пісалася Дрыяй, амаль так як Друя на Браслаўшчыне. А пра этымалогію апошняй беларуская Вікіпедыя піша так: „Існуе шэраг меркаванняў аб паходжанні назвы паселішча. Большасць з іх зыходзяць з таго, што яна ўтварылася ад назвы ракі. Паводле фіна-угорскай версіі чаргаванне гукаў «д» і «р» можа азначаць у перакладзе «вада». Паходжанне тапоніма звязваюць таксама з балцкім *druiaз* — вялікі, шырокі. У літаратуры пач. 20 ст. сустракаюцца паралелі паміж назвай Друя і словам *драць* (нібыта дзякуючы стромкаму цячэнню ракі і падводным камяням у гэтым месцы абдзіраліся лодкі, плыты). Цікавым з’яўляецца меркаванне, выказанае ў часопісе «Крывіч» (1923), што слова *друя* ў беларускай мове азначае *другая*. Так маглі назваць паселішча, перанесенае ў іншае, другое месца.” Магчыма, вось, што ўсе названыя здагадкі правільныя і вёска Дрыга перанеслася з ранейшага, празмерна наводненага месца ці месца празмернай моцы, ў больш сухое і спакойнае, *dry* ў будучнай нам мове.

Сама Дрыга зараз нічым асаблівым не вылучаецца. Вуліца вымашчаная брукам, перад шматлікімі панадворкамі крыжы на бетонных пастаментах, за ўсходнім канцом вёскі два высокія крыжы. А ў цэнтры Дрыгі мадэрная вясковая святліца, пабудаваная з прыцягненнем еўрасаюзных фондаў. І за вёскай гладкая як стол новая асфальтоўка ў бок Новага Стойла, таксама за кошт еўрасаюзнага дабрадзейства. Палі за Дрыгай рупліва апрацаваныя, расце на іх галоўным чынам кукуруза двухметровай вышыні. І адмысловыя крыжы каля кожнага палетка, магчыма, што і гэтая набожная руплівасць прычыняецца да буйнейшага ўраджаю. Жвіроўкай пасярод гэтага краявіду заходжу ў Старую Хадароўку. Вуліца ў вёсцы вымашчана змардаваным шматгадовай службай асфальтам, некаторыя панадворкі абсаджаныя ад вуліцы арэшнікам.

Пра Хадароўку Ян Гузоўскі піша так: Obok wsi Chodorówka na początku XVII w. był majątek ziemski, którego właścicielem był Chodorow. Początkowo tę miejscowość nazywano Chodorowo lub Chodorowicze, a potem przekształcono nazwę na Chodorówka. (...) Pierwszy kościół w Chodorówce zbudowano z drzewa kostkowego pod wezwaniem Przemienienia Pańskiego w r. 1617. I tamże założono cmentarz grzebalny. Parafię nazwano Chodorówka Poświętna. Na tymże cmentarzu grzebalnym w Chodorówce po przeniesieniu parafii do Suchowoli stał kościół z drzewa kostkowego dużych rozmiarów w kształcie krzyża o trzech ołtarzach, na chórze były organy, dość znacznej wyniosłości dwie wieże, gdzie były umieszczone dwa dzwony. Głos tych dzwonów, wzywających wiernych na modlitwę, było słychać aż do południowej krawędzi Suchowoli. (...) Po drugiej stronie drogi na zachód jeszcze do II wojny światowej stała stara plebania. Zbudowana była z bali drzewnych, nieco obszerniejsza jak domy wiejskie ale kryta słomą i szczyty miała słomiane. Miałem możność być w jej wnętrzu, bo byłem ministrantem i pomagałem księdzu ubierać się do mszy Św. Kościół ten przetrwał burzę dziejową (wojnę) potem po zburzeniu kościoła w Suchowoli służył jako kościół parafialny. Gdy zakładano po wojnie nową parafię w Chodorówce we wsi, służył on nadal do odprawiania codziennych nabożeństw. Pewnego jesiennego dnia kościół stanął w płomieniach. Mimo rozpaczliwej walki z żywiołem nie udało się go uratować. Spłonął doszczętnie. Przyczyny pożaru nie ustalono ale smutek wśród parafian zapanował wielki, bo byłby to zabytek pierwszej klasy. We wsi Chodorówka Nowa po wojnie zbudowano piękny kościół murowany (...) a na miejscu spalonego kościoła zbudowano kaplicę murowaną. Cmentarz grzebalny przy kościele pw. Przemienienia Pańskiego w Chodorówce Poświętnej był niedużych rozmiarów. (...) W tejże parafii w odległych jej zakątkach były cmentarze grzebalne w Połominiu, Karpowiczach, Jagłowie i [Horodniance]. (...) Dlatego tyle było cmentarzy grzebalnych na terenie parafii, bo szerzące się choroby dziesiątkowały ludzi i nie zdążano z tak odległych wsi wozić zmarłych na cmentarz parafialny do Chodorówki.

Касцёл у Новай Хадароўцы

Афіцыйны касцельны сайт: „Parafia Chodorówka wiąże swój początek z fundacją Piotra Wiesiołowskiego, marszałka Wielkiego Księstwa Litewskiego i zarządcy Puszczy Nowodworskiej. Wystawił on 1 VIII 1617 r. w Tykocinie dokument, w którym zaznaczył, że zbudował świątynią i przeznaczył proboszczowi sześć łanów ziemi. Dokument ten zatwierdził w 1620 r. król Zygmunt III Waza. W początkach XVIII w. na miejscu zbudowanego przez Piotra Wiesiołowskiego kościoła wzniesiono nowy, który pod koniec tego wieku był w opłakanym stanie i w 1798 r. władze pruskie nakazały go zamknąć, a nabożeństwa parafialne przenieść do kościoła zbudowanego w Suchowoli. Z czasem parafię zaczęto nazywać suchowolską. W Chodorówce natomiast w 1820 r. starą świątynię rozebrano i zbudowano mniejszy drewniany kościółek na cmentarzu grzebalnym. Przetrwał on obie wojny światowe, lecz spłonął 9 XI 1945 r. (...) W latach 1947-52 wybudowano nowy kościół murowany. Projekt świątyni sporządził inż. arch. Stanisław Bukowski.”

Каплічка ў Старой Хадароўцы

Касцёл у Новай Хадароўцы стаіць цяпер на ўзвышшы побач беластоцка-аўгустоўскай шашы. Глянуў я на яго і заўважыў адсутнасць крыжа на званіцы. Каля неадлеглых могілак спытаў а дзве жанчыны пра прычыну адсутнасці яго, але яны пачулі пра гэта ўпершыню. Адна з іх адказала мне, што не скажа на гэты конт ні слова, пакуль сама не ўбачыць абяскрыжанае званіцы. І стала на мяне глядзець так, быццам я абвясціў ёй канец свету. Побач згаданых могілак заўважыў я бугарок са старэнькам крыжом на ім. Калісь туды мелі быць пашыраны могілкі і пахавалі ўжо там некалькіх нябожчыкаў, аднак могілкі не былі ўзбуйнены і тое месца так асталося.

Пайшоў я ў напрамку Сухаволі. Па дарозе, пра якую я згадваў раней. Вось што пра яе пісаў у 1784 годзе хадароўскі ксёндз Ян Данішэўскі: „Droga do Korycina o milę odległego traktem jest i do Warszawy różna jest, miejscami regulowana, jednak błotnista, górzysta, kamienista, jazdy półtorej godziny. (...) Droga do Augustowa o mil siedm z Chodorowki na Suchowolę, Sztabin, z Augustowa trakt do Królewca, Gdańska, Elblonga w Prusy...” А пра самую Сухаволю той жа аўтар: „Suchowola wieś klucza dubasiewskiego na północ, od kościoła pół mili odległa, gdzie jest szkoła żydowska i niemało Żydów różnych mieszkających, miasteczkiem część jedną tej Sucheywoli nazywają.”

Міраслаў Лех у сваёй манаграфіі так піша пра пачаткі Сухаволі: „Można przypuszczać, że w ramach włócznej pomiary utworzono być może z istniejącej tu już osady dużą wieś Sucha Wola. Osady o tej nazwie były dość liczne, a umiejscowione przeważnie w miejscach przyleśnych lub śródlesnych. Wyraz „Sucha” był uzasadniony, gdyż oznaczał suchy obszar w nizinach nadrzecznych. Nazwę „Wola” dawano wsiom rolniczym, stanowiącym w stosunku do innych odrębną kategorię osad ze względu na ludność używaną do zasiedlania i nadawane jej swobody. Te swobody to przeważnie ulgi podatkowe na pewien określony czas, które dawały lepszy start gospodarczy. Wieś znajdowała się w strefie osadnictwa ruskiego z niewielką domieszką litewskiego i być może resztkami dawnych Jaćwingów. (...) W roku 1698 król polski August II wystawił przywilej zezwalający Żydom osiedlać się w Suchowoli, budować kramy i prowadzić handel. (...) Znamienny był stosunek Żydów do budowy kościoła w Suchowoli. To głównie dzięki ich staraniom i inicjatywie doszło do tej inwestycji, która została ukończona w 1791 roku. Dołożyli się też materialnie do tej budowy. Świątynia pod wezwaniem św. Piotra i Pawła wybudowana została z drzewa sosnowego kostkowego. Kościół w Chodorówce przestał być parafialnym. Postępowanie Żydów miało na celu przede wszystkim wzrost swoich dochodów (ludność przybywająca na niedzielne i świąteczne msze, przy okazji wydatnie zwiększyła obroty miejscowych kupców, rzemieślników i karczmarzy), ale też świadczyć o dobrym stosunku do ludności chrześcijańskiej. (...) Między rokiem 1766 a 1775 w miejscu wsi Suchowola założono miasto zwane Paryżem. Nazwa ta wynikająca z modnych w okresie oświecenia importów francuskich nie przyjęła się wśród miejscowej ludności, która używała pierwotnej nazwy Suchowola. W roku 1777 dzięki działalności Tyzenhausa, dzierżawcy ekonomii, którego zamiarem było zagęszczenie sieci miasteczek jako ośrodków gospodarczych dla wsi należących do ekonomii, Suchowola otrzymała prawa miejskie magdeburskie.”

(*працяг будзе*)

Вось, эканоміка!..

Чаромхаўскі самаўрад, спасылаючыся на абмежаванне выдаткаў з гміннай касы, увёў змены ў сістэму вулічнага асвятлення. Калі раней населеныя пункты былі асветлены ад змроку да світання, дык зараз усё залягае ў поцемках і апоўначы можна скруціць шыю. Радныя рашылі, што ад 23-й гадзіны да чацвёртай раніцы святло нікому непатрэбнае. Такім чынам можна зберагчы тысячы злотых. Паводле ацэнкі раднага Мікалая С., гміна месячна эканоміць на такой здзелцы 2400 зл. „За гэтыя грошы можна даць зарплату аднаму рабочаму", — канстатаваў суразмоўца. Здзіўляе мяне такое мысленне. Сярод гмінных дэпутатаў таксама няма аднадумнасці. Калі на пасяджэнні VIII сесіі ставілася праблема абмежавання вулічнага асвятлення, за прапановай прагаласавала адно палова радных, апошнія стрымаліся ад голасу. Варта прыкмеціць, што лакальная грамадскасць крытычна ставіцца да рашэння мясцовага самаўрада. Дык якая ж тут логіка ў эканоміцы, калі абраннікі народа пярэчаць самі сабе. Вось таму доказ.

7 верасня адбылася нечарговая IX сесія Рады гміны (тыдзень пазней пасля папярэдняй), на якой ставіўся адзін асноўны пункт — прыняце рашэння аб зменах у бюджэце. Пасяджэнне доўжылася не больш чым гадзіну часу. З таго, што я прыкмеціў, сталы, за якімі засядалі ўдзельнікі пасяджэння, былі застаўлены пачастункам, якога мала хто крануў. А ўсё ж такі гэта нешта каштуе. Другая справа — дыеты радным. Кожны з іх атрымаў па 160 зл. Ці гэта не абсурд? З простага рахунку вынікае, што чатырнаццаць радных за гадзіну часу страчанага на IX нечарговай сесіі атрымалі 2 240 зл. камандзіровачных. За гэтыя грошы чыгуначная станцыя і навакольныя вёскі маглі б карыстацца вулічным асвятленнем без перапынку ўсю ноч на працягу аднаго месяца. Дзе ж затым ваша эканоміка, паважаныя радныя?..

Уладзімір СІДАРУК

Зубр у аборы

Зіма з 1892 на 1893 год у Белавежскай пушчы (ды і не толькі тут!) была даволі цяжкая. Так для людзей, як і лясной дзічыны. Вясна таксама не распешчвала. Штодзённа дакучалі, як не мяцеліца з марозам, то ападкі снегу. Пачалі хадзіць погаласкі пра напады прагаладалых ваўкоў на падарожных. У Бельскім павеце замерзлі ўсе вадаёмы. Голад і прага прычыніліся да таго, што з нетраў Белавежскай пушчы пачалі выходзіць зубры ў пошуках корму і вады. Адзін велізарны зубр накіраваўся ў вёску Ласінка, што зараз у Гайнаўскім павеце. Увайшоў ён у садок мясцовай школы, спяшаючы да крынічкі, якая тут прабівалася. Сяляне неўзабаве ўвагналі зубра ў глыбокі снегавы занос, там закінулі яму пятлю на рогі і прывязалі да плота. Потым падкінулі зубру вязку сена, якое ён вельмі ахвотна з'еў і пачаў лізаць снег. Людзі вырашылі, што цяпер трэба загнаць зубра ў хлеў, каб ён не хадзіў па вёсцы і нікога не пужаў. Вядома, свабодалюбіваму каралю пушчы такі выхад не мог спадабацца. Упіраўся, як толькі мог. Пасля даўжэйшых змаганняў ласінскім мужыкам удалося зубра звязаць, загрузіць яго на сані і завезці ў пустуючую якраз абору настаяцеля мясцовага прыхода, якім тады быў а. Ян Смактуновіч. Зубр „прагасцяваў" у аборы аж да часу, калі снег пачаў раставаць. У Ласінцы доўгі яшчэ час успаміналі пра гэтае незвычайнае ў іх вёсцы здарэнне.

Пётр БАЙКО

Дажынкавы карагод з кошамі-вянкамі падрыхтаванымі жыхарамі гарадоцкіх вёсак, пасвячэнне плёну праваслаўным і каталіцкім святарамі, конкурсы, канцэрт і народная забава былі атракцыёнамі сёлетніх гмінных дажынак у Залуках. Праз гады вярнуліся сюды з Гарадка. Мясцовыя сяляне не былі задаволеныя са збору збожжа. Наракалі на надта капрызлівае, мокрае надвор'е ў гэтае лета.

Тэкст і фота Мацея ХАЛАДОЎСКАГА

Дажынкі вярнуліся ў Залукі

Мясцовыя ўспаміналі ў размове з „Нівай" дажынкавыя традыцыі. Зіна Мойсак з Залук, сяброўка калектыву „Каліна":

— У іншых можа і так, але ў нас па пожні не цягалі. Абліваліся вадой, пасля крыху выпівалі...

Спадарыня Зіна паскардзілася на сёлетняе лета:

— Было паскудна, мокра. Усё ішоў дождж. Некаторыя ўжо жніво закончылі, але некаторыя яшчэ не паспелі.

Яўгенія Грушэўская, солтыска вёскі Навасёлкі, тлумачыла нам як выканала свой дажынкавы кошык:

— Спачатку трэба зрабіць плоцік. Пасля аплятаць яго ўсялякімі кветкамі, а ў сярэдзіну пакласці плады: садавіну, гародніну. Усё, што на восень з'яўляецца багаццем. У маім кошыку ёсць таксама жыта, авёс, журавіна, верас, кветкі што зараз цвітуць. Трэба падзякаваць за дары якія дае зямля. Калісь якраз на поле прыходзіў бацюшка, асвячаў гэтыя дары, каб мы іх добра спажыткавалі, і былі здаровыя цэлую зіму.

Іншая з жанчын захаплялася кошыкам падрыхтаваным у Гарадку:

— А гэты — найпрыгажэйшы. Чаму? Бо яго рабіла мая дачка, гарадоцкая мастачка!

81-гадовы Уладзімір Дзенісюк з Валіл успамінаў:

— Памятаю, як мне было гадоў дзевяць і мама маці хадзіла на жніво з іншымі дваццаццю бабамі з сярпамі ў руках. Нават кос тады яшчэ не было! Дваццаць баб жалі, а пасля неслі вянок і спявалі. Калісь то кожны сам сабе рабіў дажынкі. Праўда, багацейшыя гаспадары. Драбняцтву не было гэта пад сілу, не хапала нават на гарэлку за плён. Можа, якая чвэртачка на пяцёх, то і так... А багаты нават барана рэзаў. І ўсіх частаваў. А такіх гмінных дажынак калісь увогуле не было. У нас ад пару гадоў арганізуюцца. Спачатку былі ў Залуках, пасля ў Гарадку, цяпер зноўку ў Залуках.

Уладзіслаў Петрук, мастак пражываючы ў Каралёвым Мосце:

— Найлепш было, як суседку, якая падабаецца, на перапёлку па ржышчы пацягаць пару разоў. І тады вядома было, што збожжа будзе як трэба! Мышы пазней зерня не з'елі. Быў час, калі ў час жніва елі яблыкі-папяроўкі і папівалі вадою. Я, калі мне было пяць-шэсць гадоў, пасвіў гусей. Выгадаваў я іх шэсць-дзесят. І ні адна мне не прапала!

Янка Карповіч з гарадоцкай капэлы „Хутар":

— Ну і яшчэ, як ужо скасілі, паліваліся вадой. А жанчыны калыхалі дзяцей на полі ў калысках, зробленых самімі.

Іаанна Чабан з ансамбля „Зараніца" (Крынкі):

— Найбольш характэрным беларускім звычаем звязаным з дажынкамі з'яўляюцца песні. На полі ў час жніва ўвесь час спявалі, і ўсе песні, і не толькі жніўныя. Жыццё вёскі вызначалі царкоўныя святы, а гэтыя былі перш за ўсё звязаныя з працамі ў полі.

Юрка Хмялеўскі, дырэктар Гміннага цэнтра культуры ў Гарадку, адкрываючы дажынкі:

— Пасля гадоў нашы гмінныя дажынкі вярнуліся туды, дзе пачаліся, значыць, у нашы Залукі. Гэтым чынам выконваем жаданне жыхароў гэтай вельмі актыўнай вёскі, дзе яшчэ абрабляюцца палеткі і збіраецца збожжа.

Староста і старасціна дажынак уручылі на рукі войта Гарадоцкай гміны Веслава Кулешы — як прадбачвае традыцыя — прыгожы бохан хлеба. Войт прамаўляў:

— Няхай заўсёды і ўсім хопіць хлеба ў нашай гміне і ў нашай айчыне [...]. Дажынкі маюць доўгую традыцыю на нашых землях. Ужо ў XVI і XVII стагоддзях спраўлялі іх для жнецоў уласнікі маёмасцей. Быў гэта пачастунак і танцы як узнагарода за добра выкананую працу пры жнівах і сабраны плён.

Валянцін Карыцкі, падляшскі віцэ-маршалак, беларус родам з сялянскай сям'і ў Бельскай гміне не скрываў: „Сёлетні год для сельскай гаспадаркі быў цяжкі. Надвор'е не спрыяла збору збожжа".

Падобна гаварыў стараста гмінных дажынак у Залуках Рыгор Карпюк са Страшава (400-гектаровую гаспадарку вядзе ён з сынам; спецыялізацыя: галоўным чынам развядзенне малочных кароў) ды старасціна Галіна Тарасэвіч з Навасёлак (гаспадарка сярэдняй велічыні, спецыялізуецца таксама ў развядзенні малочных кароў). Стараста:

— Жніво было, так сказаць, цяжкае і знясільваючае. Збожжа трэба было „выкрадаць", а не збіраць.

Старасціна:

— Зашмат дажджу. Павымакалі лугі.

Прытым спадарыня старасціна адзначыла:

— Затое малочныя гаспадаркі выгадна весці. За малако маем цяпер добрую цану — 1,40 зл. за літр, і, што найважнейшае, увесь час яго ў нас прымаюць.

У сваю чаргу спадар стараста спаслаўся на польска-еўрасаюзную сітуацыю сельскай гаспадаркі:

— На жаль, польскія земляробы маюць непасрэдныя даплаты ў велічыні адной трэцяй таго, што мае „старая" пятнаццатка. Пры нізкім еўра залатоўка ўзмацняецца, значыць, мы яшчэ больш трацім.

Сярод шматлікіх атракцыёнаў дажынак былі конкурсы, між іншым эстафета з кошыкамі поўнымі бульбы. Яе ўдзельнікамі былі маладыя мужчыны з навакольных вёсак. З боку эстрады, у драўлянай хатцы з надпісам „экалагічная гаспадарка" прапанавала паштэт з зайца і смачную бульбяную бабку Мар'янна Апановіч:

— Бябку спякла я з бульбы, укапанай сёння. Яна яшчэ цёплая, бо толькі што выцягнула яе з печкі, — хваліла страву гаспадыня.

Арганізатарамі сёлетніх дажынак у Залуках былі: гарадоцкі ГЦК, Згуртаванне вёскі Залукі над Супраслю і калектыў „Каліна". На жаль, не даехаў чаканы ансамбль „Шкляры" з Бярозаўкі на Беларусі. Затое да ночы гулялі пры музыцы гурта „Прагрэс". Раней, апрача музычных калектываў, гледачоў бавіла да слёз м.інш. кабарэ „Łza sołtysa" з Сарнак.

Тэкст і фота Ілоны КАРПЮК

Балкан-экспрэс

Экскурсія № 2

— Вы напэўна выходзіце ў Старой Пазовай? — дапытваліся пасажыры ў купэ. — Напэўна! — хаця ніхто не ведаў чаго спадзявацца. Напэўна нам здавалася, што Старая Пазова будзе цікавейшай за Новую Пазовую, хаця сёння я ўжо ў гэтым не ўпэўненая.

Новай Пазовай мы нават не планавалі пабачыць, таму няма чаго параўноўваць, затое Старая маніла нас мілагучнай назвай, якую пабачылі на раскладзе руху цягнікоў на чыгуначным вакзале ў Бялградзе. У цягнік проста мы ўскочылі, бо і рашылі падацца ў такое падарожжа імгненна, у апошняй хвіліне. Праўду кажучы, хацелі мы паехаць у Новы Сад — літаратурную, мастацкую сталіцу не толькі Ваяводзіны, але і ўсёй Сербіі. Усё ж такі было пазнавата, а тут пяцімесячны дзіцёнак на руках і начлег забраніраваны ў цэнтры Бялграда.

Сыходзім у палове дарогі. Старая Пазова. Не ведаю чаго мы спадзяваліся. Можа другога Земуна, у які яшчэ павандруем. Хутка, аднак, нашыя спадзяванні праверылі бар „Лас-Вегас" і яго мясцовыя наведвальнікі ды калекцыя „тутэйшых" перад вакзальнай залай чакання. Усё гэта хутка прымусіла нас прасіць у „благайны" паваротных квіткоў.

— Ці ёсць у вас нейкі цэнтр? — пытаем таксіста, які, відаць, чакае нас, хаця такія як мы, здаецца, часта не здараюцца.

Два еўра за курс у цэнтр не так ужо дорага, а праезд на такім выслужаным таксі можам палічыць досведам каларытнасці гэтага месца, якое пакуль што глядзіць шэрасцю. Не забывайма, што дзень ужо хіліцца да заняпаду (так, так, заняпаду!), і набліжаліся, зусім знянацку буравыя хмары. Пакуль мы гэта заўважылі, прыйшла ідэя, што лепш успрымаць будзем гэтае месца з поўнымі страўнікамі, таму папрасілі нашага „гіда" завезці там, дзе мы, турысты (!), сустрэнем „ело". Спрытна павярнуў раз, другі і вуаля!

— Тут можаце, там можаце, — размашыстымі жэстамі рук указвае на будкі з гамбургерамі. Мы анямелі на нейкую долю секунды. У Сербію прыехалі мы за ўспамінамі смакаў...

Зазірнулі ў супермаркет. Каб забяспечыць сабе прадукты на паваротны маршрут. Варта заўважыць, што ў Бялградзе, у ваколіцах цэнтра, нялёгка знайсці такіх памераў краму. Гэта якраз цешыць, таксама як факт, што ў цэнтры Парыжа не знойдзеш хмарачосаў. Аднаго мы прытрымліваліся: калі не знойдзем дзесьці цікавага меню, напэўна прададуць нам дзе-небудзь бурэк з мясам. Так і насыціліся класічным печывам, папіваючы смачным півам „LAV", якога арамат мяшаўся з паўднёвым пахам кавы. Бура прайшла даволі хутка, таму вандравалі мы ўжо пад чыстым небам. Цягнік з Бялграда ў Новы Сад (і назад) звычайна едзе гадзіну і сорак хвілін. Гэта не мяшае, каб па дарозе злапаць спазненне, хаця гэта маршрут паміж двума самымі вялікімі гарадамі ў краіне.

У свой інтэрнат вяртаемся вельмі позна. Чарговы раз прытрымліваемся пры бамбардаваных у 1999 годзе будынках тэлебачання і паліцыі. Увесь час пры іх дзяжурыць ахоўнік у мундзіры, а зруйнаваныя будынкі з аголенай тканкай стаяць сумна, але і ганарліва, як месца нацыянальнай памяці.

— А гэта памятка 1999 года, — спраўна на англійскай мове тлумачыць таксіст, які вёз нас на пачатку нашага падарожжа з аэрапорта. Успамінаючы Слабадана Мілошавіча, дастойна, але і вельмі натуральна перахрысціўся.

Больш ахвотна, чым пра трагічную, неадлеглую мінуўшчыну, дапытваў пра Польшчу і гутарыў з намі пра спорт. Калі зарыентаваўся, што і я разбіраюся ў спорце, выдатна ведаў, што асацыюю сербскіх валейбалістаў і магутнага Івана Мількавіча.

— Яго ведаюць усе жанчыны, — смяяўся. Хутка прыпомніў сабе, што ў Беластоку маем „Ягелонію". — У вас нават іграў адзін серб! — цешыўся, што знаходзім увесь час нешта супольнае. Ад гэтай радасці хуценька паказаў і распавёў нам, дзе абавязкова трэба падацца, што пабачыць, дзе адпачыць.

Ада Цыганлія сапраўды аказалася прыемным для адпачынку месцам, але шукаць на гэтай выспе слядоў даўніх Балканаў, настрояў і смакаў — дарма. Пагуляць на пляжы, паплаваць у цёплай Саве, пакатацца на ровары, пахадзіць па дрэвах ці пагуляць у мяч абсалютна так, але нічога больш. Таму намнога больш часу правялі мы ў Земуне, прыгарадзе Бялграда, дзе некаторых прыцягвае непадалёк лакалізаваная віла Мілошавіча, а нас — рыбны рэстаран на Дунаі. Не ад першай хвіліны так ахвотна заходзілі мы ў рэстаран „Дунав". Дарэчы, даведнікі заахвочвалі паглядзець іншыя месцы. Усё ж такі, зазірнуўшы за іншыя вароты, вырашылі праверыць, што хаваецца за бамбукавымі шторамі. Там мы адкрылі для сябе фантастычную закуску да піва, праз момант пачуліся як у Беларусі, дзе да піўца найлепш жаваць сушаныя кальмары ды такую ж рыбку. На Балканах рыбку смажаць на глыбокім тлушчы і ядуць цэлую, з галавой і хвастом, як бульбу-фры, бо гэта маляўкі сардзінаў. „Дунав" не толькі з-за смажанай кількі гірыца аказаўся месцам, да якога трэба вяртацца. Не разумееш мовы? І так дагаворышся, а нават пажартуеш з афіцыянтамі, якія на сваёй прафесіі зубы з'елі. У такіх месцах без жалю пакідаеш гасцінчык. І яшчэ рыбны суп. Не толькі ў Мадзьяршчыне сустрэнеш дунайскі ласунак. У Земуне закажаш яго з вялікім апетытам нават пасля візіту ў круглай, чароўнай і заадно суровай краме пасярэдзіне аднаго са шматлікіх рынкаў. У краме, у якой набудзеш любую смажаную, вэнджаную ці свежую рыбу, а як не будзеш мог вырашыцца — набудзь смажаную макрэль. З ёю можаш пару гадзін вандраваць па старых завулках Земуна, наведваючы майстроў розных рамёстваў. Гэта сапраўды чароўны, старажытны куточак Бялграда. Варта таксама адчуць магутнасць гэтага горада, якую ўяўляе між іншым кафедральны сабор Сербскай праваслаўнай царквы, асвячаны ў гонар нацыянальнага героя Сербіі св. Савы. „Храм светог Саве" ўвесь час знаходзіцца ў пабудове, але над сваімі вернікамі стаіць гадамі, нібыта сам Бог, і прыцягвае як магніт. Нас прыцягнуў у вялікі лівень. Дапамог нам адданы царкве серб з Босніі. Пад картонамі і пластмасавымі пакетамі беглі мы да трамвая, спяшаліся ў купэ нашага цягніка, які пастаянна не паспявае на Міжземнае мора.

Дасканала ведаю, што мой экспрэс па Сербіі праехаў вельмі хутка. Калі вам не было па дарозе ў гэты напрамак, прапаную задумацца над ідэяй падарожжа, асабліва з маленькімі дзяцьмі. Не сустрэла я дагэтуль еўрапейскай краіны, у якой з такой пашанай людзі ставяцца да бацькоў з малышамі. У нас людзі ў чэргах ці пасажыры ў сродках транспарту найчасцей „не бачаць" бацькоў з немаўлятамі. У Сербіі нас прапускалі ўсюды, нават калі не было такой патрэбы. Усё-такі гэтай ветлівасцю мы карысталіся. Бо ці ж не шкада ў адпачынку марнаваць час у чэргах да касы?

Дрэнная дарога

Калі ехаць ваяводскай дарогай № 687 з Беластока ў Гайнаўку цераз Жэдню, Міхалова, Юшкаў Груд і Бандары, аўтобус ПКС увесь час калоціцца, дрыжыць ды падскоквае, а шыбы ў вокнах лапацяць. Усё з-за няроўнага ўхабістага асфальтавага палатна ўжо ад Вілаў у напрамку Жэдні. Перад і за Жэдняй сёлета закончылі рамонт дарогі на 5-6 кіламетрах і тут яна роўная як верх стала. На гэта пайшлі грошы з ваяводскай касы ды бюджэту Міхалоўскай гміны. З ініцыятывай выступіў бурмістр Міхалова. Далей па шляху ў Міхалова і ў напрамку Юшкавага Груда маставой не раманатвалі шмат гадоў. Яна няроўня ды вузкая і таму небяспечная.

Чатыры гады радныя Нараўчанскай гміны дамагаліся рамонту адрэзка ваяводскай дарогі з Бандароў у Нараўку і Навасады. Дык адрамантавалі яе каля Смольніцы — 2 кіламетры. Два гады таму новы асфальт паклалі ад скрыжавання дарогі № 687 з гравійкай у Новіны ды скрыжавання з гравійкай у Лешукі каля 3 км. І як дагэтуль усё. Рамонт неабходны яшчэ перад Новым Ляўковам і за гэтай вёскай у напрамку Плянты. Зараз у гэтай справе няма ніякага зруху. Мо толькі ўсяго абяцанні ваяводскіх улад. У пісьмовай форме адказу на інтэрпеляцыі радных я не бачыў.

Ехаў я ваяводскімі дарогамі з Беластока ў заходнім напрамку і там маставыя роўныя і шырокія. А вось ваяводская артэрыя з нумарам 687 ва ўсходнім напрамку — занядбаная. Тут ясна, што Падляшскае праўленне ваяводскіх дарог у Беластоку скупіцца аднавіць гэтую адну дарогу. У Плянце ППВД паставіла асцерагальны знак і ён стаіць ужо шосты год. **(яц)**

Чаромхаўская статыстыка

Чаромхаўская гміна займае плошчу 9 673 гектараў. У дванаццаці салэцтвах пражывае 3 607 жыхароў. Стан такі зафіксаваны на 23 снежня 2010 года. У мінулым годзе нарадзілася 22 дзетак, памерла 65 чалавек. Прапорцыя народзін да смяротнасці складае 1:3. Гэты трывожны паказчык паўтараецца ў Чаромсе з году ў год. Трыццаць год таму, напрыклад, у гміне пражывала 4900 чалавек. У 1997-1998 гадах лік насельніцтва знізіўся да 4 300; тады зарэгістравана 29 шлюбных пар, нарадзілася 70 дзетак, а ў вечны спачын адышло 112 чалавек. У наступных гадах паказчыкі таксама не былі аптымістычныя. У 2000 г. насельніцтва налічвала 4 118 чалавек, нарадзілася 34, памерла 43. Пяць год пазней, у 2005 годзе, лік насельніцтва скдадаў 3 932 чалавекі, нарадзілася 30, памерла 58. Гэтыя лічбы гавораць самі за сябе. Грамадскасць старэецца. Менш народзінаў, чым пахаванняў. На дэмаграфічную дэпрэсію не паўплывала нават „бэціковае". Зараз кіруючая кааліцыя задумваецца ці не адмяніць яго, дзеля залатання дзіркі ў бюджэце. Чаромхаўскія радныя задумваюцца над мэтазгоднасцю рэалізацыі планавай інвестыцыі — пабудовы новага дзіцячага садка, зважыўшы на невялікую колькасць дзетак.

Ці штосьці пераменіцца? Цяжка сказаць. Глядзеўшы, аднак, рэалістычна на штодзённую рэчаіснасць, можна прыйсці да высновы, што ў бліжэйшым часе чакае нас шмат адрачэнняў і нягод. **Уладзімір СІДАРУК**

Ганна Кандрацюк (zorka@niva.iig.pl)

зорка
для дзяцей і моладзі

Памаліліся за поспех у школе

Сярожку Якушэвіча сустракаю за свячной лаўкай у царкве святога Юр'я. Хлапчук дапамагае тату. Разам прадаюць свечкі. Калі заплачу за свечку, пачую беларускае: *Дзякую!*

Беларускі малебен кожны год у Беластоку. Заўсёды ў канцы школьнага года. Сёлета сустрэліся і ў пачатку школы — 9 верасня г.г. Каб разам памаліцца за дзяцей, бацькоў, настаўнікаў. А пасля грамадой заспяваць: Магутны Божа!

— Памятайце, каб вы заўсёды былі дзецьмі Царквы. Каб вы заўсёды былі беларусамі, — сказаў айцец Рыгор Місіюк, настаяцель прыхода. У сённяшні час, калі амаль усе ўжо польскамоўныя, гэта складаная задача. Аднак, здавацца нельга. Бацюшка прыгадаў свой вопыт, калі працаваў на парафіі ў Драгічыне. Там маладыя ўжо не размаўлялі па-беларуску. Хапіла аднак выйсці да іх, зацікавіць.

— Пасля трох маіх выхаванцаў уступіла ў БАС (Беларускае аб'яднанне студэнтаў), — адзначыў з гонарам святар, — і аж 27 асоб прыехала з Драгічына на заснавальны з'езд Брацтва праваслаўнай моладзі. А з усяго Беластока назбіралася толькі 10 чалавек.

У апошнія гады відавочна ўзрасло зацікаўленне навучаннем беларускай мовы. У сталіцы Падляшша ўжо каля трохсот навучэнцаў: ад прадшколля — па ліцэй.

— Я ўсё разумеў, як бацюшка служыў і гаварыў, — кажа другакласнік Дамян Хамянюк, — бо хаджу ў „чацвёрку" і вывучаю мову.

Дамян, як Сярожка Якушэвіч — дзеці Царквы. Хлапчук прыслугоўвае ў беластоцкім саборы. Ён прызнаўся мне, што ў дарослым жыцці хацеў бы стаць свяшчэннікам.

— І я таксама, — дадаў іншы другакласнік, сябра Дамяна.

У час малебна спяваў па-беларуску хор і быў зачытаны па-беларуску фрагмент Евангелля. Сустрэча атрымалася малітоўнай і натхняльнай, хоць не шматлюднай. Бо, як адзначыла дырэктар Альжбета Рудчук з беларускага садка, многія бацькі і дзеці паехалі на вёску капаць бульбу. Што ж — бульба таксама беларуская справа!

ЗОРКА

Фота Ганны КАНДРАЦЮК

Васіль Хомчанка

Янкава рукавічка

Выйшла бабуля ў сад, села на ўслончык і пачала вязаць унуку Янку рукавічку.

Раніца была цёплая, ласкавая, грэла сонейка, пад страхой пішчалі вераб'і, а ў траве бегаў коцік.

Апоўдні рукавічка была амаль гатовая. Вязала бабуля, вязала, ды, седзячы, і заснула. Коцік убачыў клубок у траве, скокнуў да яго, торкнуў лапкай раз-другі, клубок і закаціўся ў кусты.

А там ляжаў Янка.

— Псік! — прагнаў ён коціка. Потым падняў клубок і пачаў намотваць на яго нітку. Матаў, матаў, а нітцы няма канца.

Бабуля прачнулася і пляснула ў далоні:

— Бацюхны мае! А дзе ж рукавічка?!

А ад рукавічкі адзін пальчык застаўся. Усю рукавічку Янка зноў на клубок пераматаў.

Вершы Віктара Шведа

Скрыпач

Тата скрыпку купіў
Здольнаму сынку Вані.
Іграць будзе на здзіў,
Скрыпачом слаўным стане.

— Чаму іграць перастаў? —
Пяцьдзесят даю злотых.
— Наш сусед больш мне даў,
Каб не іграў я дурноты.

Мудры сабака

Страшэнна хваліцца Якаў:
— Мудрага маю сабаку.
Штодзённа сабака гэты
Прыносіць з кіёску газеты.

— Не навіна гэта, дружа,
Многа сабак верна служыць.
А мой сабака харошы
Прыносіць газеты без грошай.

(З народнага календара)

Цуда і бабіна лета

Другая палова верасня і пачатак кастрычніка ў народзе называюць „бабіна лета". Тады звычайна нахлынае цяпло і стаіць сонечнае надвор'е. Чаму пра гэты час людзі гаварылі „бабіна лета"? Якраз прыпадала „бабская" работа ў агародзе і полі. Лагоднае надвор'е спрыяла ўборцы агародніны, капанню бульбы. Жанчыны таксама церлі і трапалі каноплі.

Людзі верылі, што ў гэтыя дні ластаўкі не адлятаюць у вырай, а проста хаваюцца ў зямлю.

19 кастрычніка, *Дзень успаміну пра цуд Архістраціга Міхаіла.* У народзе гэты дзень называлі „Цуда". Гэта не было афіцыйнае свята. Калі хто сеяў жыта і не ведаў, што ў гэты дзень нельга рабіць у полі, уродзіць цудоўная збажына. Аднак калі хто ведаў і свядома парушаў традыцыю, выходзячы ў поле — усё прапала. Бо тады з ураджаю атрымаецца „цуда" наадварот.

На Магілёўшчыне спынялі малацьбу, каб такім чынам засцерагчы стадолу перад ударамі перуна і пажарам.

Зорка

Музыка з кайфам

„Granda" Бродкі

http://muzyka.dziennik.pl

Вырашыла я напісаць пра Моніку Бродку не таму, што спявае па-беларуску, не таму, што яе трэці альбом аказаўся вялікім поспехам, не таму, што гэта адна з цікавейшых і яшчэ вельмі прыгожых маладых вакалістак, але перш за ўсё таму, што паказала як семнаццацігадовая дзяўчына з маленькай вёсачкі на поўдні Польшчы, дзякуючы настойлівасці і адвазе, сягае зор. У яе тысячы прададзеных альбомаў, сотні канцэртаў і задавальняючая прафесія вакалісткі. Моніцы Бродцы зараз 24 гады, а вопыту як у старога ваўка.

За сем гадоў музычнай дзейнасці на мінулым тыдні ўпершыню прыехала ў Беласток. Добра, што якраз з трэцім альбомам „Granda", бо гэты дыск паказвае зусім новы твар вакалісткі. Як сама падкрэслівае, адчувала ўжо стомленасць папярэднімі песнямі, разыходжанне паміж яе музычнымі зацікаўленнямі і песнямі, пісанымі надалей для маладой дзяўчынкі. Вырашыла запісаць альбом не толькі згодны з яе творчым развіццём, але проста вясёлы. І нават калі спявае пра даволі складаныя справы, распавядае лёгкай, неадназначнай мовай. Дзякуючы супрацоўніцтву з геніяльнымі польскімі аўтарамі маладога пакалення, Будынем і Радкам Лукасевічам, атрымаліся тэксты, у якіх часта паяўляюцца амаль забытыя словы і звароты.

— Гэта была такая місія і мэта, — гаворыць Моніка. — Каб „Granda" стала крыніцай зваротаў, якія выйшлі з карыстання, каб можа некаторыя вярнуліся менавіта ў маладое пакаленне.

На трэцім альбоме Моніка не забывае пра свае карані. На народных інструментах іграе яе бацька, Ян Бродка, сапраўдны гураль. Можна сказаць, што ў пэўным сэнсе каляровае афармленне альбома і канцэртаў, каляровыя стужкі, якія паяўляюцца таксама ў кліпах, маюць сваю крыніцу ў гуральскай культуры. А пры нагодзе рэалізуюцца і іншыя мастакі. Напрыклад, аўтаркай часткі касцюмаў, у якіх выступае Моніка Бродка, з'яўляецца маладая праектантка Дамініка Гжыбэк з Беластока. Што ж, хочацца сказаць: рабі, што любіш, а поспехі прыйдуць!

i_basovka@o2.pl

Конкурс пра восень (2)

Прывітанне, сябры! У нас працяг восеньскага конкурсу. У гэты раз мы завітаем у беларускія лясы і ў мастацкую галерэю. Сярод прапанаваных варыянтаў пазначце правільныя адказы:

1. Як у народзе называюць галоўнае земляробчае свята?

а) Купалле,
б) Багач,
в) Дажынкі.

2. Дзе паводле народных меркаванняў 14-15 верасня знікаюць ластаўкі?

а) адлятаюць за мора на поўдзень,
б) адлятаюць на поўнач у Арктыку,
в) хаваюцца ў зямлю.

3. Якой гароднінай у Паўночнай Амерыцы аздабляюць панадворкі ў свята Галаўін?

а) бульбай,
б) дынямі і гарбузамі,
в) кукурузай.

4. Хто аўтар славутай карціны „Бабіна лета"

а) Хелмоньскі,
б) Пікасо
в) Тарасэвіч

5. Якія грыбы ў беларускіх лясах мы сустрэнем у верасні?

а) баравікі,
а) маслякі,
в) шампіньёны.

Адказы дасылайце да 30 верасня 2011 г. (найлепш па электроннай пошце на адрас „Зоркі"). Тут разыграем цікавыя ўзнагароды: беларускія кніжкі і гульні.

Адказ на конкурс **„Восень, восень залатая"**: *1) Ганна; 2) 9; 3) Сакрат Яновіч; 4) Бардаўская восень; 5) Бабіна лета.* Узнагароду, кніжку **„Рыцары і дойліды Гародні"**, выйграў **Лукаш Марчук** з Нараўкі. Віншуем!

ЗОРКА

Міра ЛУКША

З „Паравінаў года"

Ваўкі:

Мы мацёрыя ваўкі!
Мы палохаем усіх!
Як разявім зяпы —
Вашы сэрцы ў пятах!
Асабліва ў качанятак!
Востры ў нас кіпцюр і зуб!
Мы вас хутка: хап ды скуб!

Качаняты:

Качаняткі-жаўцяняткі!
Вы не ідзіце яшчэ спаткі!
Расплюшчвайце вачаняткі!
На падворак выйдзьце з хаткі!

Размахніце крылцы ўбок!
Уверх хвост! Вышэй дзюбак!
Нам не страшны ліс і воўк!
Квак-квак-квак, квак-квак, квак!

Вось качыны наш атрад!
Адступайся, воўча, узад!
Разам многа моцы маем!
Разам у ножку наступаем!

Размахнем крылом жаўтлявым
Управа-ўлева, улева-ўправа!
Не баімся — не, не, не!
Наша сіла — у гурце!

Польска-беларуская крыжаванка № 38

Запоўніце клеткі беларускімі словамі. Адказы, з наклееным кантрольным талонам, на працягу трох тыдняў дашліце ў „Зорку". Тут разыграем цікавыя ўзнагароды.

Адказ на крыжаванку № 34:

Мёд, сок, пыса, посуд, жолуд, лёс, страва, сноп, спор. Ёд, сын, порт, пол, рысунак, суд, карп, каляндар.



Тэкст і фота
Аляксея МАРОЗА

Багаты вясельны абрад „дарэння”

Калі як малады *сват* пачаў я хадзіць на вясковыя вяселлі ў пачатку васьмідзесятых гадоў, яшчэ захоўвалася частка вясельных абрадаў, якія перадаваліся на нашых землях з пакалення ў пакаленне, але ўжо ў моцна акроеным выглядзе. Аднак ужо і тады не спатыкалася паслявясельнага гасцявання ў чацвер і суботу, з чым часта сустракаліся яшчэ мае бацькі. Пазней людзі пачалі ў штораз большай ступені адракацца ад вясельных традыцый. На нашы вяселлі сталі пранікаць элементы польскай традыцыі, напрыклад, *ачэпіны*, якія старэйшыя людзі лічылі непатрэбным *выдурняннем*. Калі на зломе васьмідзесятых і дзевяностых гадоў мой сваяк жаніўся ў Ленінградзе, пасля вянчання госці абедалі ў рэстаране, а танцавалі ў студэнцкім інтэрнаце. З вясельных абрадаў захавалася тады толькі блаславенне маладых на новую дарогу бацькамі. Дваццаць гадоў пазней падобнае можна заўважыць таксама на многіх нашых вяселлях (канешне, не маю тут на ўвазе ежы, ці ўмоў для танцавання). Вясельная навізна прыйшла ж да нас не з усходу, а з захаду. У час вяселляў у Гайнаўцы, Бельску ці Беластоку (штораз радчэй ладзяцца вяселлі ў вясковых святліцах, у якіх паўсюдна сталі спраўляць хаўтуры) практычна зніклі вясельныя абрады, уключна з *пэрэпіваннем*. Нават падарункі сталі даваць адразу пасля вянчання або неадкладна пасля прыезду ў гасцінны дом. У масавым маштабе захаваўся толькі абрад блаславення маладых бацькамі з дапамогай іконы. Перад выездам у царкву бацькі акрапляюць яшчэ свячонай вадой шыкарныя машыны, на якіх маладыя едуць вянчацца. Рэканструкцыю даўніх вясельных абрадаў праводзяць зараз на Беласточчыне ў галоўным Музей малой айчыны ў Студзіводах і Гайнаўскі дом культуры, які ў супрацоўніцтве з гасцямі з Беларусі арганізуе ў амфітэатры вясельныя бяседы. У час сёмага па ліку вясельнага мерапрыемства, наладжанага ў амфітэатры ў Гайнаўцы, яго арганізатары засяродзіліся на абрадзе *дарэння*, які інакш называецца *падзелам каравая*, а ў нас — *пэрэпіваннем*.

— У мінулым годзе мы рэканструявалі цэлае вяселле, затрымліваючыся пакрысе на ўсіх абрадах. У гэтым годзе рашыліся поўнасцю паказаць *дарэнне* з усімі яго адметнасцямі, песнямі, прымаўкамі і нестандартным захаваннем вясельнікаў. *Дарэнне* — самы цікавы і самы характэрны для вяселля абрад, у час якога былі спевы, танцы, шматлікія прымаўкі і жарты, якія ўдала весялілі гасцей, — расказваў Васіль Пілюцік, галоўны рэжысёр вясельнага абраду і мастацкі кіраўнік калектыву „Ойра” з Пружан. — Вашы вяселлі падобныя да нашых, а калі ёсць розніца, то ў галоўным тычыцца самой мовы, песень, ці прымавак. Аднак у гэтым плане ёсць розніцы нават паміж непадалёк распаложанымі ад сябе вёскамі. Удала атрымаліся ў нас рэпетыцыі і таму ўдала могуць выступаць супольна калектывы з Беласточчыны і Пружанскага раёна.

Ад імя Беласточчыны запрэзентаваліся вясельныя госці і заадно спевакі з калектыву „Рэха пушчы” і танцоры з гурту „Перапёлка” (абодва з ГДК), вясельныя госці, спевакі і танцоры з калектыву „Рэчанька” з Козлікаў і вакальны дуэт „Зараніца” з Крынак. З Пружан прыбылі музыканты і танцоры з Тэатра танца „Ойра” і спевакі з вакальнага калектыву „Пружаначка”, а са Смольніцы прыехаў вакальны калектыў „Смаляначка”. Усе замежныя і нашыя калектывы заслужана ўзнагароджваліся гарачымі апладысментамі.

Танцуе „Перапёлка”

За сталом поўным ежы (і з банкухам, што паявіўся на пэрэпіванні адносна нядаўна) гасцявалі вясельнікі з Пружанскага раёна і Беласточчыны (вясельную атмасферу ўзмацняла сцэнічнае афармленне ў выглядзе вясковай хаты)

„Смаляначка”

— Мы рэканструюем вяселле на такі лад, як калісь у нас было. Нават у маёй маладосці на вяселлі гулялі тыдзень з перапынкамі. Аднак, хаця ў мінулым было многа гульняў і гасцявання, усё ж такі больш па-божаму ўсё адбывалася. Маладыя перад вянчаннем удзельнічалі ў літургіі і прычашчаліся, — успамінала Люба Гаўрылюк з Козлікаў. — Што тычыцца *пэрэпівання*, якое мы паказваем, то было яно ў нас вельмі разбудаваным. *Пэрэпівалі* ж маладых лялькамі, гусакамі, ці іншай усячынай. А колькі ж фокусаў маршалак прыдумваў.

Пэрэпіванне меў весці маршалак з Пружан, але захварэў. Удала замясціла яго сватка Аксана Кавалевіч з Пружан, а ад імя польскіх беларусаў пра абрад расказала Ала Каменская. Хаця ў гайнаўскім амфітэатры не дарылі маладым гусака, то *пэрэпілі* іх веласіпедам.

— З даўніх вясельных абрадаў асталіся ў нас толькі блаславенне бацькамі перад выездам на вянчанне, — заявілі Ліля Арабчук і Аліна Жукавіцкая з гайнаўскага „Рэха пушчы”. Васіль Андраюк з гэтага ж калектыву ўдакладніў, што з *пэрэпіваннем* на даўні лад сустракаўся апошні раз можа 15 гадоў таму. Мае суразмоўцы дадалі таксама, што парознаму бывае з заязджаннем па маладую. У самой Гайнаўцы цяпер малады часта спатыкаецца з маладой толькі ў царкве. У іншых выпадках едзе да яе дому, каб супольна з каханай прыбыць у храм. Залежыць гэта ад традыцый, якія абавязвалі ў паасобных сёлах і якія былі перанесены ў гарады.

На абрад *дарэння* рыхтавалі ў мінулым па некалькі караваяў. Так было ў час гайнаўскага вяселля. Аднак тут быў наладжаны яшчэ конкурс на самы лепшы каравай і аказалася, што ўсе нашыя і замежныя калектывы, якія падрыхтавалі па адным караваі, атрымалі раўнапраўныя першыя месцы. Пасля караваі рэзалі на кускі і раздавалі публіцы. Аднак перад салодкім вясельным падарункам сабраным прапанавалі па кілішку і мясную закуску з хлебам, так як у мінулым частавалі людзей, якія выстойвалі пад вокнамі вясельнай хаты і заглядалі ўсярэдзіну, каб убачыць, што там адбываецца. Канешне, пры такой вялікай публіцы пачастунку ўсім не хапіла, але ж самым важным было захаванне традыцыі. Публіка мела магчымасць развучыць народныя танцы, між іншым падыспан. Арганізатары мерапрыемства хацелі, каб сабраныя як мага актыўней уключыліся ў ход абраду.

— Кожны год паказваем беларускае вяселле. Два разы былі ўключаны элементы цыганскага і курпёўскага вяселляў. Не паспеў я зрэалізаваць задумы, каб паказаць фрагмент вяселля польскіх горцаў, — гаварыў гайнаўскі віцэ-стараста і былы дырэктар ГДК Андрэй Скепка, які асабіста шэсць разоў наглядаў за арганізацыяй штогадовай вясельнай бяседы і сёлета таксама не мог выседзець сярод публікі і штораз заходзіў за сцэну амфітэатра, каб паразмаўляць з выступаючымі і працаўнікамі ГДК. Сёлета за ходам вяселля наглядаў выконваючы абавязкі дырэктара ГДК Расціслаў Кунцэвіч. Узнагароды калектывам, якія пяклі караваі, уручыў асабіста віцэ-стараста Андрэй Скепка. Сярод публікі сядзелі бурмістр Ежы Сірак і яго намеснік Васіль Сцепанюк.

Для арганізавання абраду вяселля ў амфітэатры некалькі гадоў назад спецыяльна было падрыхтаванае сцэнічнае афармленне ў выглядзе хаты, якая стварае адпаведны настрой. Аднак атмасферу перш за ўсё ствараюць людзі, якія выступаюць на сцэне. Іх спевы, танцы, прымаўкі, а таксама звычайныя размовы спрычыняліся да таго, што выканаўцы на сцэне паказваліся шматлікай публіцы ў амфітэатры натуральнымі вясельнікамі. На мерапрыемства прыйшлі таксама бацькі з малымі дзеткамі, якія бегалі па вялікай пляцоўцы перад сцэнай або стаялі з бацькамі, гледзячы на сцэну. Вакол амфітэатра размясціліся ларкі з ласункамі і цацкамі. Побач амфітэатра дзеці маглі пазабаўляцца ў гарадку гульняў. У мінулым дзеткі таксама не сядзелі разам з вясельнікмі за сталом, толькі гулялі на панадворку, дзе ім выносілі ежу і ласункі.

— У больш адлеглым мінулым у Беларусі ішлі на вяселле са сваёй бутэлькай гарэлкі і закускай. Таму нават бяднейшыя сяляне маглі ладзіць вялікія вяселлі, — гаварыў рэжысёр Васіль Пілюцік. У нас вяселлі таксама былі шматлюднымі, бо музыканты былі адносна танныя, памяшканне ў выглядзе хаты, а яшчэ раней — клуні, было дармовае. У больш адлеглым мінулым асноўнай закускай на вяселлях была цёплая вараная свініна, якую бралі рукамі. Старэйшая публіка, гледзячы на *пэрэпіванне*, з настальгіяй успамінала сваю маладосць, калі наогул была здаровай і вясёлай.

Ілона КАРПЮК

Старік, куды ты?!

Запытваючы „A ty starik kudy?” можна паспрабаваць даведацца ў які бок імкнецца сучасная беларуская культура. Пад такім загалоўкам беластоцкія арганізатары мерапрыемства, якое прайшло ў мінулую суботу, 10 верасня, увесь час стараюцца паказаць яе незалежны, еўрапейскі твар. Застаецца, аднак, уражанне, што яна надалей крамольна выходзіць з падполля.

Фота Радка Дамброўскага

Пасля 2,5-гадовага перапынку ў залу Беластоцкага асяродка культуры вярнуліся творцы беларускай культуры, прэзентуючы розныя віды мастацтва. „Starik” мае ўжо свае традыцыі, таму абавязкова з'явіліся кіномастацтва, музыка ды візуальныя прэзентацыі. Усё было ў дастатковай дозе, можа толькі публіка не была шматлюднай. Як не дзіўна, найбольшае зайцікаўленне выклікаў вернісаж выстаўкі „Belarus Press Photo”.

— Цешуся, што можам прэзентаваць гэтыя здымкі ў такой вялікай зале, — дзякаваў ў час адкрыцця фотажурналіст і суарганізатар конкурсу Вадзім Заміроўскі. — Сёлетняе ўручэнне ўзнагародаў і першая прэзентацыя прайшлі ў маленькім памяшканні прыватнай студыі „Знята”, бо ў афіцыйных месцах нам не дазволілі.

У конкурсе прымаюць удзел фатографы незалежныя, як і тыя, якія працуюць для афіцыйных і неафіцыйных сродкаў масавай інфармацыі. Праблемай для прэзентацыі вынікаў гэтага выпуску стала колькасць узнагароджаных здымкаў зробленых непасрэдна ў час падзеяў 19 снежня 2010 года (паслявыбарчыя маніфестацыі), ды момантаў, якія ў нейкі спосаб маюць дачыненне да гэтых здарэнняў, як напрыклад партрэт кандыдата ў прэзідэнты, пісьменніка Уладзіміра Някляева.

— Прыблізна пяцьдзесят працэнтаў гэтых фатаграфіяў у Беларусі мы паказаць не можам, — дадаў Заміроўскі. — Не хочам, каб гэты конкурс быў ладжаны напалову падпольна. Нас цікавіць мастацтва і журналісцкая праўда. Шкада гэтых сапраўды добрых працаў.

Выстаўка прэзентавала здымкі з двух зладжаных дагэтуль выпускаў, 2010 і 2011 года. Раней мінулагоднія конкурсныя працы паказваліся ў Кракаве, але зацікаўленне гэтай выстаўкай можа паспрыяць чарговым прэзентацыям у Польшчы. На жаль, аднак, паўтараючы за Вадзімам Заміроўскім, у аднясенні да Беларусі і яе культуры ў Польшчы і на Захадзе цікавяцца толькі тым, што мае дачыненне да палітыкі і Лукашэнкі. Добра было б тады, каб за выстаўкай па Польшчы ездзілі таксама музыка, фільмы, творцы. Хаця калі ідзе пра гэтых апошніх — варта перадумаць, каго прэзентаваць і хто гэтую культуру мае атаясамліваць. Здавалася б, няма лепшай рэкламы, калі з фільмам прыедзе яго рэжысёр. Доўгачаканая ў Беластоку „Масакра” Андрэя Кудзіненкі думаю не расчаравала, але шмат пытанняў можна ставіць у аднясенні да разумення культуры самім аўтарам, які моцна расчараваў публіку, а нават арганізатараў. Такім чынам ад яго пра фільм не даведаліся нічога, а хто спрытнейшы пагутарыў з Аляксандрам Дзебалюком, прадзюсерам і мантажыстам „Масакры”, на якога студыі здымаўся таксама важны фільм Кудзіненкі „Містэрыя. Акупацыя”, прэзентаваны тут у 2005 годзе. Першы беларускі фільм жаху ці бульба-харор можна пахваліць. Вельмі зручна рэалізатары выйшлі з апрэсіўнай сітуацыі, бо каб ствараць сучасныя жахі, трэба мець мноства грошай і доступ да высокаразвінутых тэхналогіяў. Можа якраз іх недахоп расчараваў у такім сэнсе, што немагчыма было пабачыць, як чалавек пераўтвараецца ў мядзведзя. З другога боку скарыстаныя спецыяльныя эфекты якасна ўпісваліся ў кантэкст цэлага фільму. Пасля паказу з'яўляліся пытанні „Што аўтар хацеў занесці гледачу?”, але сам жанр дае адказ: жахі ставіцца дзеля прыемнасці, што падкрэсліў таксама рэжысёр. „Масакру” можна палічыць усё ж такі „харорам лірычным”, бо і жахаў у ёй не так і шмат. Трэба спадзявацца, што закладзены новы жанр, „бульба-харор”, будзе ў далейшым запаўняцца новым зместам.

Вечарыну „A ty starik kudy? vol. III” распачаў аднак другі фільм. „Ваўкі” Аляксандра Колбышава (рэжысёра, але і акцёра, які выступіў таксама ў „Масакры”), гэта вяртанне да ваеннай тэмы ў беларускай кінематаграфіі. Фільм зняты ў канвенцыі савецкага кіно, але ў выніку атрымалася вельмі цікавая карціна, прытым якасна зрэалізаваная. Цытуючы галасы з публікі гэта „адзін з лепшых беларускіх фільмаў, які дагэтуль бачылі”. Ажно шкада было, што не даехаў рэжысёр фільма, бо здавалася, што сустрэча з ім (праўдападобна не так манерным як Кудзіненка) магла б дапоўніць прыемнасць ад гэтага сеансу. Госцем паказу быў Ігар Аўдзееў, дырэктар Музея гісторыі беларускага кіно. Чалавек на афіцыйным штаце, якому даволі складана было выказацца на натуральныя пытанні з залы „чаму такія ўдалыя фільмы здымаюцца на рускай мове, асабліва калі гістарычная праўда пацвярджае, што ў месцы падзеяў твора ў той час гаварылася пабеларуску?”. Ігар Аўдзееў спрабуючы захаваць нейкую раўнавагу ў сваіх выказваннях гаварыў пра адмоўныя рысы беларускага кіно, перад усім пра хібы ў функцыянаванні дзяржаўнай кампаніі „БеларусьФільм”. І тут абавязкова трэба папоўніць, што паказваныя ў Беластоку стужкі аўтарства „незалежных” рэжысёраў, былі фінансаваныя і рэалізаваныя „БеларусьФільмам”. Узнікае натуральнае пытанне, ці гэта пазітыўны сігнал, ці наадварот, тупік. Тупік і ў тым сэнсе, што хаця гэта дзяржаўныя творы, але ў кінапракаце іх пэўна не пабачым. Дарма тады чакаць меркаванняў беларускіх гледачоў, пра водгукі якіх таксама пыталіся ў спадара Аўдзеева. Сярэднестатыстычны беларускі глядач гэтых фільмаў проста ня ведае.

Вечар закончыўся канцэртам вельмі пазітыўнай групы Botanic Project. Наогул рэгі-саўндсістэмы асацыяваюцца з недаакрэсленымі гукамі і пахам марыхуаны, а вось тут у клубе „Фама” склалася музычнае свята, бо гурт гучаў намнога лепш чым у запісах. Можа не было шмат публікі, бо беластачане насцярожана ставяцца да новых прапаноў, тым больш, што гэта ж гурт з Беларусі. Цікава, што побач зарыентаваных у культуры рэгі, харэ крышна ці раста, на танцполі гулялі гарадзенцы. Мерапрыемства прамавалася не толькі ў лакальных СМІ на польскім баку мяжы, але можна было таксама пра яго даведацца на вельмі папулярным гарадзенскім сайце www.s13.ru, дзе чытачы самі заахвочвалі, каб пасля пакупак у беластоцкіх маркетах, беларусы засталіся на гэтым культурным мерапрыемстве. Да гэтага між іншымі імкнемся, каб знікнулі ўсялякія штучныя прадузятасці датычныя польска-беларускай мяжы.

Дар'я ЛІС

ФЕСТЫВАЛЬ-КІРМАШ „ЗАЛЕССЕ ЗАПРАШАЕ СЯБРОЎ”

6 жніўня 2011 года ў вёсцы Залессе на Смаргоншчыне прайшоў чарговы, трэці па ліку, фестываль-кірмаш „Залессе запрашае сяброў”.

Удзел у свяце прынялі майстры народнай творчасці, калектывы мастацкай самадзейнасці, жыхары Залесся і ваколіцаў.

На свяце можна было набыць вырабы мясцовых майстроў, пакаштаваць стравы залескіх гаспадыняў, пачаставацца напоямі і адварамі народнай кухні, падсілкавацца салам, яйкамі, поліўкай.

На адкрыцці свята выступіў намеснік старшыні Смаргонскага райвыканкама Аляксандр Вярсоцкі. Потым на сцэне выступілі мясцовыя калектывы мастацкай самадзейнасці і сольныя выканаўцы, а таксама госці з Польшчы (этнаграфічны калектыў „Цаглінкі”), Расіі (Масква, фальклорны гурт „Кірмаш”), Віцебска (калектыў мастацкай самадзейнасці „Віцебскаблгаз”) і суседніх з Залессем Жодзішак (гурт песні і танца „Вечарынка” Жодзішкаўскага ЦДК). Выступіў з прамовай і старшыня беларускіх суполак Літвы Раман Вайніцкі.

Жыхары Залесся запрасілі гасцей у свае імправізаваныя падворкі, дзе госці маглі пачаставацца язэпаўкай, шмурдзюком і іншымі прысмакамі. У мястэчку гасцей і сяброў свята сустракалі ў сямі падворках: арганізацыі „Сяльчанка”, „Жыць здорава!” Залескай амбулаторыі, „Шутавіцкія прысмакі” жыхароў Шутавічаў, „На хатку немаўлятку”, „Пачастунак”, дзе гаспадарыла Людміла Гружэўская, Карчма „Агінец”, падрыхтаваная моладдзю, і „Казачная паляна” Залескага цэнтральнага дома культуры.

http://talaka.elitno.net

Тут за тысячу-дзве рублёў можна было набыць бліны з рознай начынкай, вафлі, грыбы, рагалікі і іншую выпечку залескіх гаспадыняў. Пачаставацца напоямі, настойкамі, квасам. Прадаваліся таксама цукровыя пеўнікі, дранікі, бутэрброды з салам. Супрацоўнікі Залескай амбулаторыі адкрылі фітабар з квасам, травянымі настоямі і чаямі. Побач працавала „аптэка”, дзе былі „лекі” ад мярцвення канечнасцяў, „ад удаўленія”, ад усіх хваробаў, „для кахання” і іншыя.

Як і на іншых святах, свае вырабы прадавалі народныя майстры, працавалі атракцыёны для дзяцей.

Напрыканцы фестывалю старшыня сельсавета Зянон Грышкевіч адзначыў гаспадароў дамоў узорнай культуры Залесся, а таксама тых, хто ладзіў падворкі для кірмашу.

Арганізатары свята былі вельмі рады прыезду беларусаў Польшчы („Цаглінкі”) і спадзяюцца на ўдзел іншых польскіх калектываў у наступным свяце. Рады будуць у Залессі і прыезду народных майстроў са сваімі вырабамі.

Імя Міхала Клеафаса Агінскага насамрэч аб'ядноўвае беларусаў, палякаў і літоўцаў ды пераносіць нас у часы Вялікага Княства Літоўскага ды Рэчы Паспалітай.

У гэты раз фэст прайшоў не ля сценаў палацу Агінскіх (там урэшце распачалася рэстаўрацыя), а ля будынка былога санаторыя-прафілакторыя. Гэты аб'ект можа пераўтварыцца ў добры гатэль, што так патрэбен мястэчку, але і ён „чакае” свайго фундатара, дакладней, уладальнік санаторыя шукае надзейнага партнёра для аднаўлення працы санаторыя.

Міхась КУПТЭЛЬ

Ініцыятывы жыхароў Махнатага

Калі чытаеш тэксты Аляксея Мароза, Аляксандра Вярбіцкага ці іншых аўтараў у «Ніве» або «Часопісе», то складаецца ўражанне калі не катастрофы, то глыбокага заняпаду ўсходняй часткі Беласточчыны, заселенай пераважна беларусамі, што аўтары пішуць толькі таму, каб адлюстраваць апошнія хвіліны беларушчыны ў гэтым кутку краіны.

Гэтая частка Гайнаўшчыны, ад Ласінкі ўзяўшы, праз Трывежу, Новае Беразова, Хітру, Міеські Лес (Пасечнікі-Дужэ), Старое Беразова, Махнатае, ці вёскі Дубіцкай і Чыжоўскай гмін, як помню, не цікавіла журналістаў беларускіх медыяў як калісь, так і цяпер. Можа гэта правакацыйнае сцвярджэнне, але не давялося мне чытаць змястоўных рэпартажаў пра жыццё тамашняга насельніцтва.

Заахвочваю журналістаў, перш за ўсё Беластоцкага тэлебачання, беларускай рэдакцыі Радыё Беласток і Радыё Рацыя наведаць успамянуты куток, бо тут многа змянілася. Чаму акурат гэтыя медыі заахвочваю? А менавіта таму, бо людзі яшчэ слухаюць і аглядаюць, бо з чытаннем «Нівы» ці «Часопіса» ёсць нейкія праблемы, аб якіх, думаю, ведаюць іх галоўныя рэдактары.

Змянілася тут многа за апошні час, хоць людзі наракаюць, бо магло б быць лепей. Перш за ўсё зямля тут не ляжыць аблогам, дае плён, затым хтось пра яе дбае. Праўда, бачныя аб'явы аб продажы сядзіб на вёсках, але больш будуецца. Гэта відаць простым вокам, не гаворачы пра поўную механізацыю апрацоўкі зямлі ці жывёлагадоўлі, перш за ўсё малочных кароў.

А якая якасная інфраструктура лакальных дарог. Мне лекар рэкамендаваў як найбольш руху, а для мяне найлепшы рух гэта веласіпедны рух, і то па асфальтавых дарогах паміж вёскамі ўспамянутага кутка Гайнаўшчыны. Проста, Еўропа! Вядома, задбала пра гэга дэмакратычна выбраная ўлада, якая ведала як пакарыстацца еўрасаюзнай дапамогай. Не ўспамінаю пра водаправоды і вясковыя ачышчальні сцёкаў. Смецце на вёсках прыбірае Прадпрыемства камунальных паслуг з Гайнаўкі.

А што для душы? Апрача арганізаваных аднаразовых фэстаў па вёсках, ад маленькіх, як Шастакова, да вялікіх, як Старое Беразова, працуюць вясковыя клубы. Не ведаю пра штодзённую дзейнасць гэтых культурных устаноў, але хачу сказаць некалькі слоў пра вясковы клуб у Махнатым.

Клуб вялікі — глядзельная зала са сцэнай, дзе адбываюцца забавы і большыя культурныя мерапрыемствы; зала, у кутку якой, як рэлікт мінуўшчыны, стаіць сумны тэлевізар, більярдавы і пінг-понгавы сталы; зала з кухняй, у якой адбываюцца сямейныя ўрачыстасці; трэнажорная зала з поўным абсталяваннем для падтрымання фізічнага здароўя; зала з шасцю камп'ютарамі. Камп'ютары, аб'яднаныя ў лакальную сетку, з'яўляюцца абсталяваннем «Centrum Kształcenia „Wioska internetowa — kształcenia na odległość na terenach wiejskich". Projekt jest współfinansowany przez Unię Europejską w ramach Europejskiego Funduszu Społecznego — EFS». Інтэрнэт-вёска паўстала па ініцыятыве жыхароў Махнатага, солтыса Аляксея Герасімюка і пры выдатнай дапамозе войта Гайнаўскай гміны Вольгі Рыгаровіч. Заняткі ў Цэнтры адбываюцца пяць разоў у тыдзень (апрача панядзелкаў і чацвяргоў) пад вопытным кірункам інструктара Крыстыны Красько.

Калі людзі маюць вольную хвіліну для сябе і ахвоту рабіць штосьці іншае, чым хатнія штодзённыя заняткі, і знойдзецца хтось, хто збярэ гэтых людзей у калектыў, то паўстае, напрыклад, вакальны калектыў. Такім ініцыятарам стварэння вакальнага калектыву ў Махнатым з'яўляецца грамадскі дзеяч Аляксей Герасімюк. Вакальны калектыў пад мастацкім кіраўніцтвам Пятра Скепкі меў ужо першыя публічныя выступленні ў Махнатым 6 чэрвеня г.г. з нагоды вандроўкі ўдзельнікаў фестывалю «Там по маёвуй росі», арганізаванага Дарафеем Фіёнікам, якія завіталі ў Махнатае па дарозе ў Карыцінск, і на фэсце ў Старым Беразове 24 ліпеня г.г. Па-мойму, гэта класная ініцыятыва.

Апрача калектыву, каб ажывіць грамадскасць, можна сказаць, што на маіх вачах, члены калектыву заініцыявалі стварэнне Таварыства любіцеляў Махнатага (Towarzystwo Miłośników Mochnatego). Ініцыятыўная група прыгатавала праекты патрэбных дакументаў для рэгістрацыі ТЛМ (ТММ) у старастве ў Гайнаўцы. Чаму ў старастве, а не ў судзе? Проста таму, што гэта таварыства звычайнае, якое можа заснаваць прынамсі тры асобы і, паводле законаў, непатрэбная цэлая бюракратыя пры рэгістрацыі і існаванні таварыства як юрыдычнай асобы. У праекце статута запісана, што сядзібай ТЛМ будзе Махнатае, і што мэтай яго дзейнасці будзе, між іншым, дзейнасць у карысць жыхароў вёскі, папулярызацыя гісторыі вёскі і ваколіц, папулярызацыя беларускай асветы і культуры, супрацоўніцтва з іншымі беларускімі таварыствамі.

Па-мойму, гэта другая цікавая ініцыятыва жыхароў Махнатага.

Са свайго боку падкінуў я Таварыству прапанову, каб дамагалася ад улад добраўпарадкавання чыгункі з Гайнаўкі ў Бельск і прыстасавання яе на веласіпедную турыстычную сцежку (аб веласіпеднай сцежцы больш змястоўна пісаў я ўжо на старонках «Нівы»). Прапанова спадабалася членам калектыву і, мабыць, звернуцца з такой ініцыятывай да улад Гайнаўкі і Бельска. Вядома, што інакш на такую ініцыятыву будзе глядзець улада залежная ад сваіх выбарцаў, а інакш глядзіць на прапанову індывідуальнай асобы, хаця б і карэспандэнта «Нівы».

Сёння, калі Беларусь знаходзіцца ў глыбокім эканамічным крызісе, многія сведкі лёсавызначальных падзей на пераломе 80-90-х гадоў мінулага стагоддзя, шукаюць нейкае падабенства гэтай і той сітуацыі. На беларускіх апазіцыйных сайтах часцяком публікуюцца матэрыялы, прысвечаныя выступам дэмакратаў канца існавання савецкай дзяржавы. Гэтая настальгія ўжо выйшла з рамак асобных артыкулаў і інтэрв'ю на цэлыя сайты. Адным з іх стаў сайт „Вытокі", які месціцца ў інтэрнэце па адрасе **http://vytoki.net.**

На першы погляд сайт выглядае вельмі нязвыкла. Яго назва, напісаная чырвоным колерам, блякне на карычневым фоне цэлага выяўлення. Пошук, які звычайна знаходзіцца з левага боку, тут месціцца пасярэдзіне ўверсе выяўлення, нават вышэй за выйсці да старонак. Прычым спачатку падаецца, што гэтых самых старонак усяго тры, — „Галоўная", „Дакументы", „Дадаткова", з-за чаго вельмі цяжка адразу зразумець тэматыку сайта. Толькі фотаздымкі канца 80-х — пачатку 90-х гадоў, што змяняюцца на галоўнай старонцы, і астатнія выйсці да рубрык унізе выяўлення наводзяць на думку аб гісторыка-палітычнай яго арыентаванасці. Замацоўвае гэтую здагадку рубрыка „Дэклярацыя", дзе ідэйныя натхняльнікі сайта распавядаюць пра каштоўнасць сваёй працы. „Кожнае вольнае слова, кожнае здабытае права, кожная адноўленая справядлівасць, кожны вызвалены палітвязень — гэта адваяваны крок на шляху да свабоднай дэмакратычнай Беларусі. Каб не збочыць, не згубіць кірунку, варта памятаць пра вытокі, не забывацца пра тых, хто пракладаў маршрут. Будучыня — у руках тых, хто валодае мінулым", — распавядаюць аўтары сайта.

Гэтым мінулым, згодна далейшай інфармацыі, валодаюць, па меншай меры, Асамблея няўрадавых дэмакратычных арганізацыяў Беларусі, Праваабарончы цэнтр „Вясна", арганізацыі „Дыярыуш" і „Цэнтр Супольнасць". Сабе на мэту яны ставяць спробу „захаваць, выратаваць ад цемры ды ілжы найноўшую гісторыю нашай свабоды — гісторыю разьвіцця грамадзянскай супольнасці і вызвольнага руху апошніх дзесяцігодзьдзяў савецкага рэжыму, а таксама рэжыму, які ўсталяваўся ў Беларусі пасля прэзыдэнцкіх выбараў 1994 году".

Несумненна, справа, за якую ўзяліся прадстаўнікі чатырох узгаданых вышэй арганізацый, вельмі высакародная. Але падыходзіць да яе па-аматарску не варта. А менавіта так, па ўсім відаць, падышлі стваральнікі сайта, калі выбіралі яго будову. Сёння навігацыя па сайце даволі складаная, і не толькі таму, што выйсці да рубрык знаходзяцца ўверсе і ўнізе выяўлення. Да прыкладу, пералік асоб выстаўлены невядома ў якім парадку, таму каб знайсці звесткі аб патрэбнай постаці, трэба перагартаць некалькі старонак.

З таго відавочна, што праца над сайтам яшчэ мусіць быць працягнутая, асабліва ў дачыненні навігацыі. Менавіта тады ён, як было заяўлена на прэзентацыі сайта ў чэрвені ў Мінску, у поўнай меры стане архівам, дзе, „размешчаны матэрыялы грамадскіх арганізацый, грамадскія і прыватныя зборы, якія датычацца паўстання грамадзянскай супольнасці і апазыцыйных рухаў у Беларусі цягам мінулага і бягучага стагоддзяў".

Уладзімір ЛАПЦЭВІЧ

С БЕЛАРУСІ ы

Аўгустоўскі канал

Са школьных падручнікаў геаграфіі яшчэ савецкага часу мы добра ведалі пра два штучныя водныя шляхі — Суэцкі і Панамскі каналы. Прынамсі ведалі пра час іх капання і пра кантынентальнае знаходжанне. Пра сваё ж, куды больш блізкае ў кожным сэнсе — прыкладам канал Агінскага ў Слоніме ці Аўгустоўскі канал нам не казалі ні слова. Нібы нічога гэтага не было зусім. А між тым Аўгустоўскі канал, пра які пойдзе гутарка, відаць, не мае аналагаў у еўрапейскай гідратэхнічнай гісторыі.

Штучны водны шлях, які злучыў басейны рэкаў Нёман і Вісла, быў пабудаваны ў 1824-33 гадах пад кіраўніцтвам розных інжынераў. Капальнай і муроўнай працы папярэднічалі дзве грунтоўныя даследчыя экспедыцыі пад кіраваннем Ігната Прандзінскага і Аляксандра Віртымбергскага. Цэнтральнай жа асобай быў падпалкоўнік Карл Рэес, які меў адмысловую адукацыю. Адкрыццё каналу адбылося ў 1839 годзе. Каб зразумець цікавае памкненне ідэолагаў гэтага праекту безумоўна патрэбна зазірнуць у кантэкст усяго дзевятнаццатага стагоддзя. Расійская імперыя пад час кіравання цара Аляксандра I вяла мытную вайну з Прусіяй і ёй патрэбны быў зручны абыход прускіх зямель. Да пабудовы прывяла найперш гаспадарчая мэтнасць — з басейну Віслы можна было такім чынам перавозіць грузы ў Балтыйскае мора.

Агульная даўжыня каналу ажно 102 кіламетры (для параўнання Панамскі мае працягласць 82 км), з іх на тэрыторыю Беларусі прыпадае 22. Сярэдняя глыбіня 1,8 метра, зразумела, што ёсць участкі глыбейшыя, а ёсць і досыць плыткія. Тэрытарыяльна Аўгустоўскі канал ахоплівае сучасны Гарадзенскі раён і землі Сувалышчыны. Назва каналу пайшла ад павятовага цэнтру Аўгустаў, з возера Сервы паблізу яго бярэ пачатак гэты водны транзіт. Асноўным „пасярэднікам" паміж дзвюма вялікімі рэкамі, апяянымі ў беларускай і польскай літаратурах, выступае рэчка Бобра. Акрамя яе ў водным праекце задзейнічаная Чорная Ганча, розныя азёры і сажалкі, пратокі паміж імі. На Гарадзеншчыне Аўгустоўскі канал працякае паміж вёскамі Чарток і Нямнова. Усяго на канале 18 шлюзаў, з якіх толькі 4 на тэрыторыі сучаснай Беларусі.

У наш час канал з каралеўскім імем страціў сваё гаспадарчае і транспартнае значэнне і стаў вылучна турыстычным аб'ектам. Дакладней, такім ён толькі становіцца. Доўгі час у дваццатым стагоддзі водны шлях быў у занядбаным стане. Польская дзяржава намнога хутчэй зразумела перспектыву гістарычна-прыроднага аб'екту і стала выкарыстоўваць яго напоўніцу. У наваколлях Аўгустоўскага каналу паўсталі шматлікія асяродкі адпачынку, найперш і галоўным чынам агратурыстычныя гаспадаркі, якія хутка заваявалі значную папулярнасць. З беларускага боку землі вакол Аўгустоўскага каналу працяглы час былі недаступныя шырокаму колу і „каланізаваліся" наменклатурай, якая рыхтавала свае інтарэсы. Па дарозе на Сапоцкін быў выстаўлены нават адпаведны пост памежнікаў, уезд быў строга па пропусках. Так што аднойчы нашу краязнаўча-вандроўную групу затрымалі як парушальнікаў „зоны", не пусцілі і нават спрабавалі аштрафаваць. Давялося даводзіць свае правы праз скаргі і ўрэшце справа была зачынена. Аднак, знаёміцца з Аўгустоўскім каналам і яго наваколлямі мы паехалі ўжо з польскага боку. Цяпер памежную зону ў нас ужо знялі, на канал возяць школьныя і іншыя экскурсіі. Аднак гаварыць пра паўнавартаснае развіццё шляху пакуль рана, ранейшага „Свята мора" на шлюзе Дамброўка яшчэ няма.

Аўгустоўскі канал зноў злучыў Віслу і Нёман. Але вярнуць Беларусь у еўрапейскую прастору ён пакуль не ў змозе.

Уладзімір ХІЛЬМАНОВІЧ

Заклік

Іаанна ЧАБАН
joanna.czaban@gmail.com

Прыйшла да мяне, здаецца, нядрэнная думка. На пачатак мушу прадставіць у пару словах яе генезіс. Сваё жыццё я дзялю на зусім розныя часткі: даэміграцыйнае, эміграцыю і постэміграцыю, з якіх дзве першыя, вядома, неяк пранікаліся, супольна ствараючы характар той трэцяй, пакуль апошняй. Мая постэміграцыйная, крынкаўская экзістэнцыя характарызуецца перш за ўсё шматлікімі спробамі здзяйснення сваіх жыццёвых мараў і планаў. Мушу прызнацца, што пры дапамозе ўнутранай дысцыпліны і ўпартасці памалу ўдаецца мне пабудова задуманага жыццёвага парадку, пра які не буду тут многа распісвацца. Дадам толькі, што гэты парадак шмат чаго каштуе, але ўсё-такі ў канчатковым выніку аплачваецца — варта старацца. Адным з неабходных яго элементаў з'яўляецца пошук сваёй тоеснасці і ейнае адабрэнне. Прытым трэба неяк упісацца з гэтым у меншы і большы краявід, каб сапраўды адчуць сябе „ў хаце". Свой поспех пакуль заўважаю ў прасторы маленькага, старадаўняга драўлянага доміка, у якім жыву — стаіць ён у канцы Крынак. Мае суседзі таксама выдатна ўпісваюцца ў гэтую амаль ідылічную, свойскую атмасферу; гэта пажылыя, скромныя людзі, з якімі бяседую пад хатай, частуемся па-свойску агароднінай і садавіной.

Атмасферу хатняй прытульнасці хочацца расцягнуць на ўсе Крынкі, а мо і рэгіён. У маім выпадку свойская прытульнасць раўназначная з высокай культурай (у тым ліку таксама і асабістай) і творчасцю, без якіх не ўяўляю сабе сапраўднага шчасця. Вядома, маю на ўвазе перш за ўсё культуру родную, беларускую, менавіта ёй прысвячаю штораз больш увагі і часу. Ужо ўдалося мне супольна з блізкімі мне людзьмі заснаваць культурнае таварыства „Terra Incognita" і штосьці там па меры сваіх сіл і магчымасцей робім, стараючыся адказна рэалізаваць заданні і дасягаць задуманых намі мэт. Атрымліваю ад гэтага вялізную асалоду, задавальненне і ўжо не ўяўляю свайго жыцця без такога тыпу дзейнасці, таксама як не ўяўляю сябе без маёй любімай дачкі Тані. Думаючы ў апошні час пра чарговыя планы і праекты звязаныя са статутам нашай арганізацыі, памеціла я адсутнасць сапраўднага, усебеларускага свята культуры. Мару пра сур'ёзнае, маштабнае мерапрыемства, якое паказала б нашу меншасць у Польшчы з найлепшага боку і стала яго пазітыўнай візітнай карткай. Праўда, маем безліч усялякіх бясед, фэстаў і іншых беларускіх ініцыятыў, ладжаных у меншых і большых падгуртках, найчасцей паміж сабою пасвараных. Усё ж такі, варта было б падумаць і неяк аб'яднацца дзеля стварэння добрай імпрэзы для нас усіх (тут маю на ўвазе не толькі нашых беларусаў, але і людзей звонку). Можна было б запрасіць нашых творцаў-суайчыннікаў не толькі з Падляшша, але і з Беларусі ды з іншых краін і кантынентаў, у якіх яны пражываюць. У рамках такога беларускага свята культуры трэба было б памясціць, напрыклад, розныя віды музыкі, пачынаючы з класікі, а канчаючы на эстрадзе, паказаць цікавыя фільмы, спектаклі, выстаўкі жывапісу, сустрэць літаратараў. Размарылася я тут па поўнай праграме. Але ж усё гэта магчыма зрабіць, толькі ахвота патрэбна.

Веру ў тое, што маем дастаткова адпаведных людзей, якія маглі б гэтым заняцца. Людзей добра падрыхтаваных, з ведамі, вопытам і ініцыятывай. Я сама б з задавальненнем уключылася ў арганізацыю, партнёрства такога тыпу мерапрыемства. Спадзяюся, што нашы радзімыя дзеячы беларускай культуры зацікавяцца прапановай і пазітыўна адгукнуцца на мой заклік ці то на старонках „Нівы", ці на маю прыватную пошту.

Адгадайка

Шыфраграма

Літары адгаданых слоў, перанесеныя згодна з іх парадкавымі нумарамі ў клеткі роспісу, складуць рашэнне — страфу Ніла Гілевіча.

1. апорная частка збудавання, аснова = 129 _ 128 _ 140 _ 85 _;
2. мужчынскі голас = 138 _ 67 _ 68 _;
3. неглыбокае месца на ўсю шырыню ракі зручнае для пераходу = 144 _ 133 _ 145 _ 146 _;
4. ручны складны паўкруг для абмахвання ў духату = 20 _ 113 _ 120 _ 29 _;
5. фурманка = 117 _ 116 _ 114 _;
6. газападобнае паліва = 61 _ 59 _ 107 _;
7. шум, гул, гудзенне = 108 _ 109 _ 93 _ 92 _ 99 _;
8. штучны насып для засцярогі ад затаплення вадой = 27 _ 33 _ 115 _ 119 _ 51 _;
9. не ноч = 52 _ 53 _ 86 _ 17 _ 50 _;
10. маленькі хлопчык альбо дзяўчынка = 12 _ 13 _ 16 _ 15 _ 14 _;
11. без агню не бывае = 110 _ 31 _ 32 _;
12. горад на Рудні, дзе працавалі Мсціславец з Фёдаравым = 121 _ 122 _ 123 _ 89 _ 60 _ 103 _ 134 _ 135 _;
13. снежань, студзень, люты = 79 _ 90 _ 87 _ 80 _;
14. бакал = 6 _ 69 _ 124 _ 125 _ 42 _;
15. шарсцяны дыван ручнога вырабу = 81 _ 78 _ 82 _ 83 _ 46 _;
16. не сячэ павінную галаву = 26 _ 130 _ 127 _;
17. Іван, савецкі агратэхнолаг (1855-1935) = 40 _ 41 _ 91 _ 36 _ 2 _ 39 _ 38 _;
18. частка сушы, якая вострым вуглом выходзіць у вадаём = 77 _ 76 _ 18 _;
19. вузкая шчыліна, у якую ўстаўляюць выступ другога прадмета пры замацаванні = 132 _ 45 _ 131 _;
20. вялікі гай з алеямі і кветнікамі = 1 _ 3 _ 72 _ 71 _;
21. фізіялагічны працэс выхаду на свет дзіцяці = 101 _ 102 _ 136 _ 137 _;
22. пахавальны ўбор з белай тканіны для нябожчыка = 141 _ 100 _ 142 _ 143 _ 30 _;
23. сее зерне = 97 _ 98 _ 106 _ 112 _ 54 _ 37 _.
24. форма тулава = 70 _ 34 _ 105 _ 104 _;
25. важная фігура = 19 _ 23 _ 11 _;
26. пробныя ўздзеянні на аб'ект з мэтай вывучэння яго дзеяння, від экзамену = 63 _ 62 _ 56 _ 57 _;
27. вялікая неядавітая драпежная трапічная змяя = 73 _ 94 _ 95 _ 96 _;
28. верхняя частка галавы = 49 _ 48 _ 47 _ 5 _;
29. „вусаты" горад на рацэ Бася ў Магілёўскай вобласці = 126 _ 21 _ 58 _ 28 _ 4 _ 118 _;
30. літаратурнае прозвішча Мікалая Раманоўскага = 44 _ 43 _ 35 _ 55 _ 147 _;
31. малы чыж = 22 _ 111 _ 24 _ 25 _ 84 _;
32. абласны горад на поўдні Казахстана = 66 _ 64 _ 65 _ 88 _ 139 _ 75 _ 74 _;
33. выхаваўчая ўстанова для найменшых дзяцей = 10 _ 9 _ 7 _ 8 _.

(ш)



Сярод чытачоў, якія на працягу месяца дашлюць у рэдакцыю правільныя адказы, будуць разыграны кніжныя ўзнагароды.

Адказ на адгаданку з 33 нумара

Брод, Піна, дыск, урок, юнак, Чорны, якар, Скарына, Зэльва, Гая, авёс, нарцыс, вясло.

Рашэнне: **Парады дурню карысныя як соль вавёрцы.**

Кніжныя ўзнагароды высылаем **Міхалу Байко** з Беластока і **Казіміру Радошку** са Свебадзіцаў.

19.09 — 25.09

(22.03. — 20.04.) Апошняя дэкада месяца — час гарачых сустрэч. Заззяеш на іх інтэлектам і ведамі, ачаруеш рашучасцю. На працы лепш быць ужо не можа! Без высілку справішся з усім, падкінеш работу іншым (а яны яшчэ падзякуюць!). 19.09. перапоўніць цябе радасць жыцця, эйфарыя. 21-25. будзеш хутка мяняць свае планы і задумы, бунтавацца, даказваць сваю рацыю. Выглядаць будзеш цудоўна, здаровы і вясёлы!

(21.04. — 21.05.) Усё пойдзе спраўна, ідэальна, калі плануеш рамонт і паляпшэнні дома. Добрыя лады ў фірме, пахвалы кіраўніцтва. Можа трапіцца табе лепшая пасада. Пільнуйся толькі на дарозе, асабліва калі едзеш на машыне. Да 21.09. можаш блага накіраваць свае пачуцці, не зразумець слова „не".

(22.05. — 22.06.) Канец з лянотай! Можаш шмат зарабіць. У апошняй дэкадзе месяца будзеш паводзіць сябе як слон у складзе парцаляны. Не высмейвай іншых! Можа табою зацікавіцца хтосьці намнога ад цябе маладзейшы. Вырашы старэйшыя справы з мінулага. Даруй крыўды і правіны.

(23.06. — 23.07.) Варта табе падумаць пра нейкія курсы, абучэнні, пачытаць аб тым каб памножыць свае прыбыткі. Хаця ад 19 да 23.09. можаш не мець сілы, каб справіцца з усімі абавязкамі. Не вельмі адкрывайся перад сябрамі (не ўсё зразумеюць). Могуць турбаваць цябе болі гартані і горла (кінь курыць, калі смаліш!).

(24.07. — 23.08.) Новыя шанцы, добрыя выпадкі — неўзабаве будзеш мець ад гэтага прыбыткі. Усё, за што цяпер возьмешся, прынясе табе перамогу. Да 22.09. гарантуюцца табе поспехі на ўсіх палях. 24-25.09. не ўсе цябе будуць любіць; не насі высока свайго носа.

(24.08. — 23.09.) Да 23.09. ты перапоўнены сонечнай энергіяй. Калі паявіцца нейкая нямогласць, справішся з ёю без аптэкі. 22-25.09. аформіш кожную справу, здабудзеш павагу і захапленне іншых. З 25.09. (да 30.09.) — пачнуцца цяжкія дні, калі твае старанні пойдуць упустую.

(24.09. — 23.10.) Да 21.09. хтосьці можа цябе выкарыстаць для сваіх мэт, твае заслугі прыпісаць выключна сабе. 23.09. адчуеш вялікі прыліў энергіі, будзеш дынамічны, поўны энтузіязму і запалу. 25.09. удадуцца важныя размовы, пертрактацыі, вызначэнні і сустрэчы; заззяеш ведамі, рэфлексам і інтэлігентнасцю. Усё пойдзе па тваім плане.

(24.10. — 22.11.) Да 21.09. не ацэньвай іншых засурова, бо іншыя цябе таксама слаба ацэняць. З 19.09. станеш баявітым і рашучым, у кожнай справе паставіш на сваім і нікога не дапусціш да голасу. Памятай, што і ты калісьці быў пачаткоўцам. Пільнуйся: да 21.09. можаш трапіць у абдымкі крутога спакусніка.

(23.11. — 22.12.) Будзеш мець сілу трох мацакоў і паправіш сваю кандыцыю. Варта гэты час выкарыстаць на трэнінг. Пры важных рашэннях будзь асцярожны, усё добра абдумай. 20-24.09. можаш пераборшчыць з чымсьці — не траць часу і не марнуй сілы.

(23.12. — 20.01.) Да 21.09. можаш стаць ахвярай інтрыг; калі штосьці цябе турбуе, паразмаўляй з партнёрам. Пасля схочацца пабываць, пакантачыць — выйдзеш да людзей, якія прымуць цябе з адкрытымі рукамі. Будзеш ветлівы і далікатны, нават калі штосьці ляпнеш, нікога не абразіш. Калі не ведаеш, ці не паспееш, не бяры зашмат на сябе. Найдасканалая форма — да 23.09.

(21.01. — 19.02.) 21-25.09. будзеш удачлівы, паслядоўны і вельмі вынаходлівы. Знойдзеш выхад з цяжкай сітуацыі. З 24.09. (да 29.09.) не плануй падарожжа; можаш згубіцца нават на простай дарозе. Не пачынай канфліктаў (размова, якую непатрэбна адцягваеш, удасца).

(20.02. — 21.03.) Аб твой поўны кашалёк найбольш задбае... Юпітар. Інтуіцыя, як звычайна, дапаможа табе выкруціцца з кожнай сітуацыі. Ты цяпер вельмі спраўны арганізатар, асабліва ў хатніх справах. Поспехі на працы. Не адкідай шалёных задум — якраз фантазія падкіне найбольш трапныя ідэі!

Агата АРЛЯНСКАЯ

Ніва
ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ
PL ISSN 0546-1960
NR INDEKSU 366714

Выдавец: Праграмная рада тыднёвіка „Ніва".
Старшыня: Яўген Вапа.
Адрас рэдакцыі: 15-959 Białystok 2, ul. Zamenhofa 27, skr. poczt. 84.
Тэл./факс: (+48 85) 743 50 22.
Internet: *http://niva.iig.pl/*
E-mail: *redakcja@niva.iig.pl*
Zrealizowano dzięki dotacji Ministra Spraw Wewnętrznych i Administracji.
Галоўны рэдактар: Яўген Вапа.
Намеснік гал. рэдактара: Віталь Луба.
Тэхнічны рэдактар: Адам Паўлоўскі.
Рэдактар „Зоркі": Ганна Кандрацюк-Свярубская.

Публіцысты: Мікола Ваўранюк, Аляксандр Вярбіцкі, Ганна Кандрацюк-Свярубская, Ілона Карпюк, Міраслава Лукша, Аляксей Мароз, Мацей Халадоўскі, Віктар Сазонаў, Уладзімір Хільмановіч, Міхась Сцепанюк, Янка Целушэцкі.
Канцылярыя: Галіна Рамашка.
Друкарня: „Orthdruk", Białystok.
Tekstów nie zamówionych redakcja nie zwraca. Zastrzega sobie również prawo skracania i opracowania redakcyjnego tekstów nie zamówionych. Za treść ogłoszeń redakcja nie ponosi odpowiedzialności.
Sprzedaż egzemplarzową „Niwy" prowadzą: kioski i punkty sprzedaży „RUCH" na terenie woj. podlaskiego oraz w Warszawie (odbiór należy zgłosić u sprzedawcy wybranego kiosku lub punktu sprzedaży „RUCH"), placówki pocztowe i listonosze w woj. podlaskim, siedziba redakcji „Niwy".
Prenumerata krajowa
Termin przyjmowania wpłat do 5-go dnia każdego miesiąca poprzedzającego okres rozpoczęcia prenumeraty.
Wpłaty przyjmują urzędy pocztowe na terenie województwa podlaskiego oraz oddziały „RUCH" i „KOLPORTER" na terenie całego kraju.
Cena prenumeraty kwartalnej — 32,5 zł., półrocznej — 65 zł., rocznej — 130 zł.
Prenumerata z wysyłką za granicę
Wpłaty przyjmuje „RUCH" S.A. ul. Jana Kazimierza 31/33, 01-248 Warszawa; telefony: +48(0)22 53-28-823 — prenumerata płatna w walucie obcej, 0-2253-28-816, 53-28-819; — prenumerata płatna w PLN; nr faxu: 0-2253-28-734
Prenumerata w redakcji
Planowana ilość numerów „Niwy" w 2011 roku — 52.
Przesyłka zwykła: Cena 1 egz. wraz z wysyłką w kraju wynosi 4,2 zł.
Wpłaty przyjmuje: Rada Programowa Tygodnika „Niwa",
BANK PEKAO S.A. O/Białystok
38 1240 5211 1111 0000 4929 0945

Nakład: 1 000 egz.

„Забываеце пра нас, беларусаў з Сямятыччыны!” — папракаў нас неаднойчы Язэп Карпюк з Сямятыч, паэт, аўтар слоў і музыкі песні „Журавы”, вядомай ва ўсёй Польшчы і за яе межамі, якая ўжо лічыцца народнай. Яго жоравы ляцяць на поўдзень, а мы за імі — у Нурэцкую гміну Сямятыцкага павета. Гэта адно з найчысцейшых месцаў „Зялёных лёгкіх Польшчы”.

Тэкст і фота Міры ЛУКШЫ

Раз на 1010 гадоў!

У Нурэцкай гміне з амаль пяці тысяч жыхароў беларусамі запісалася 13,36% насельніцтва. Паводле падлікаў мужчын тут больш чым жанчын, а лясы займаюць палову зямлі. Гміна пачынаецца сто кіламетраў на поўдзень ад Беластока, а яе сталіца распаложана ў 20 кіламетрах ад павятовага горада. У старажытную вёску, што амаль пры самым Нурцы-Станцыі, перасаджваюся ў Сямятычах на аўтобус у Клюкавічы — еду наўкола, бо ў нядзельны час, 28 жніўня, не ўсе аўтобусы ездзяць па вёсках. Падаюся спецыяльна на мерапрыемства — Першы Дзень Жэрчыч, пра які паведаміла рэдакцыю Надзея Карчэўская, родам з Рагачоў, якая ўжо амаль 15 гадоў жыве ў Жэрчычах. І горнуцца да яе людзі, не толькі праваслаўныя. Заснавала яна пры гмінным цэнтры культуры ў Нурцы-Станцыі народны калектыў „Незабудкі”:

— Даў мне на старасць Бог лепшае здароўе, добрую памяць і крыху талентаў. Нельга ж закопваць сваіх умеласцей і магчымасцей у зямлю. Рашыла я паварушыцца, захацелася мне знайсці падобных сабе. Села на ровар і паехала ў Залессе, да Ніны Якімюк. І рушыліся мы ўсе разам, пры падтрымцы Ірэны Яношук, дырэктаркі Нурэцкага цэнтра культуры. Афіцыйны „хрэст” „Незабудак” адбыўся аж у перадзім'е 2010 года, урачыста, з рукі войта Нурэцкай гміны Пятра Яшчука. Спявалі тады Надзея Карчэўская, Ніна Цімашук, Валя Грыцюк, Оля Філоц, Антаніна Грушэўская, Марыя Шпанская, Галіна Пытэль, спявалі песні свойскія, старыя. Сёння заспяваюць яны не раз, праўда, у меншым складзе, бо дзве сяброўкі заснавалі другую групу — „Залясянкі” — і спяваюць там з акамапаніятарам Антонам Капэлькам, які падыгрывае і калектыву з Радзілаўкі „Крыніца”.

У вёсцы Жэрчычы, якая 12 км ад Грабаркі і 16 км ад Сямятыч, красуецца вялікая мураваная царква, каля якой штогод затрымліваюцца паломнікі на Святую Гару Грабарку. Вёска Жэрчычы мае свой пачатак у далёкім багатым мінулым. Розныя меркаванні аб назве мясцовасці: адны кажуць, што бярэ яна свой пачатак ад слова „жэрд”. Ваколіца была пакрытая маладым лесам, у якім вырэзвалі жэрдкі для агароджы. Далей лес пераходзіў у разлеглую пушчу — Жэрдчыцкую, якой назву змянілі пасля на Мельніцкую. Магчыма, што назва — ад імя „Жырко”, магчыма, што і ад „жраца”. Вядомая гісторыя гэтай зямлі сягае XV і XVI стст., калі яе ўласнікамі былі роды Клюковіцкіх і Нурэцкіх. А ўся зямля асацыюецца са Святой Гарой Грабаркай ды манастыром святых Марыі і Марты.

— Жэрдчыцы былі градам, вайсковым пастарункам, баронячым галоўны град Мельнік і спалучаючым яго з Бельскам, — мяркуе Раіса Пахвіцэвіч, шматгадовы войт Нурэцкай гміны са слаўнага роду Вольскіх. — Быў гэта пункт, якому пачатак дала збройная дружына кіеўскага князя, якая тут білася з яцвягамі. Князь яцвягаў загінуў у няроўнай бітве разам са сваімі ваярамі, якіх целы дружыннікі пахавалі з вялікай чэсцю для геройскіх яцвягаў. Воі сабралі іх целы, коней, зброю і спалілі ды насыпалі высокі, да сёння захаваны курган (ён за рэчкай, як ехаць у Забалацце). У 1944 годзе быў пастаўлены там крыж, а было іх там тры. Імя геройскага яцвяга было Краўс.

Усе гістарычныя дакументы, якія перахоўваліся ў царкоўным архіве (яны згарэлі 22 ліпеня 1944 г. у пажары царквы) называюць дату ўзнікнення тут праваслаўнага прыхода на 1001 год! Дружына кіеўскага князя была пад сцягамі мучаніка Дзмітрыя Салунскага, заступніка войска. Храм будавалі самі парафіяне. Калі той храм быў узведзены, не кажа ніякі дакумент. Дакументы ўспамінаюць, што тая першая царква (да 1872 г.) была старая і не магла ўжо стаяць, перанеслі яе на могільнік. Старажытныя ліпы, паміж якімі стаяла, растуць да сёння. Пра вёску ўзгадваюць дакументы таксама як пра „Забітэ Село” або „Жабе Село” ў дакументах з 1580 і 1851 гадоў. Асаблівую старонку ў гісторыі парафіі запісала Ціхвінская ікона Багамаці (ікона загінула ў пажары 1944 г.). Ікону гэтую знайшлі ва ўспомненым кургане. Была там драўляная капліча, крытая саломай. Хто хацеў, заходзіў туды маліцца і пакідаў там сваю ахвяру. Пасля цудатворная ікона была перанесена ў вялікую царкву і змешчана перад алтаром у адпаведным ківоце. Рыза на ікону і карона былі аздоблены дарагім каменнем і ахвярамі за дапамогу, вымаленую Уладычыцай. Тыя каштоўнасці і былі пасля выкарыстаны на пабудову мураванага храма. Год 1654 быў годам гістарычнага выпрабавання. Адзін з атрадаў шведаў дайшоў да Жэрчыч. Швед хацеў выстраліць у ікону, якая згадвала Чанстахоўскую Адзігітрыю. Порах разарваў дула, выпаліў яму вочы і той у пакуце пазваў імя Уладычыцы. Уратаваны швед застаўся жыць пры храме. Новая ікона, ахвяраваная ў 1947 г. за спаленую, з'яўляецца копіяй цудатворнай Ціхвінскай.

— Наконт цудаў, дык хоць яны трапляюцца, дык цудаў няма. Трэба цуду памагчы і апынуцца ў адпаведным месцы і ў адпаведным часе, — „Вайтова” Раіса (мянушка засталася ёй, хоць войтам Нурэцкай гміны ўжо другі тэрмін з'яўляецца Пятро Яшчук) гэтак кажа наконт Надзеі Карчэўскай, вядомай не толькі ў ваколіцы артысткі і краўчыхі, завадатаркі не аднаго праекта. — Дзень Жэрчыч адбыўся перш за ўсё дзякуючы ёй!

— А я малілася, каб такое надвор'е было! — усміхаецца спадарыня Надзея. — І нягорача, і няхоладна. Кропелька дажджу капнула зранку, а прадказвалі ліўні! Моладзь добра пагуляе. Наехала і з ваколіцы, прыбылі нават госці з Чаромхі. Уявіце сабе — першая такая імпрэза за 1010 гадоў існавання Жэрчыч!

У мінулым годзе сабраліся былі ў Нурцы, паспявалі крыху. Але гэта — не тое.

— Мелі б мы сваю святліцу! — уздыхае Надзея. — Яшчэ „Вайтова” прадала два будынкі старадаўняй вадапомпы. Калі б мы раней сабраліся, схамяналіся, дык не далі б, і ў вадапомпе зрабілі б святліцу. А тут нанялі палатку для выступаючых, падключылі электраток ад бара... Пазычылі на імпрэзу пляц за барам, з Машчонай-Панскай прывезлі іхнія лавы з-пад святліцы, склікаліся... І вельмі многа залежала ад маладой нашай солтыскі, Альжбеты Дэц. Яна жыве тут недалёка. Пакончыла школы, вярнулася ў вёску, тут выйшла замуж.

— І так нам удалася імпрэза, якая не была планаванай! — войта Нурэцкай гміны Пятра Яшчука нечакана для яго выклікала да мікрафона вядучая імпрэзу Ірэна Яношук. — Усё звязала разам Надзея Карчэўская. Калі б не яе імпэт, энергія, натхнёнасць, здаецца, нічога не ўдалося б. Паддала нам духу ўсім! Нурэцкі дом культуры знайшоў грошы на тое, каб заплаціць гурту, які падыгрываў да 20 гадзіны, а на „аркестр” і ахову склаліся ўсе Жэрчычы. І спалучылі мы дні Жэрчыч з дажынкамі. Пра абрад дажынак раскажа спадарыня Надзея, якая ведае ўсе важныя абрады людзей вёскі.

— Да мерапрыемства даклалася ўся вёска, — раднаму Аляксандру Пахвіцэвічу аж успацелі акуляры, калі пералічваў спонсараў — старажытныя тутэйшыя прозвішчы. Салэцкая рада ў асобах: Надзея Карчэўская, Лявон Анішчук, Дарыюш Мантур, Рыгор Богдан, Анатоль Дубінскі, і вяскоўцы: Яўген Карнялюк, Пятро Яшчук, Агнешка Петручук, Ілона Садоўская, Альжбета Дэц, Барбара Богдан, Вячаслаў Дамарацкі, Ніна Любінская, Ганна Раманюк, Анатоль Дубінскі, Аўгіння Дубінская, Збігнеў Колтак, Барбара Верамяевіч, Юзаф Кардалевіч, Лявон Анішчук, Пятро Раманюк, Зіна Літвінюк, Мікалай Драбюк, Крыстына Панасюк, Уладзімір Філоц, Анна Мучко, Надзея Мантур, Яўгенія Раманюк, Дарыюш Сачко, Аляксандр Пахвіцэвіч...

Імпрэзу пачала капэла „Баравяне”, якая, як і ўсе выступаючыя, іграла і спявала беларускія, паляшуцкія, украінскія, польскія і рускія песні. Сябруюць тут паміж сабою калектывы, абменьваюцца песнямі і нават акампаніятарамі. З Радзілаўкі прыбыў калектыў „Крыніца”, скумаваны з жэрчыцка-залеска-нурэцкімі „Незабудкамі”. Пенсіянерска-касцельна-патрыятычная нурэцкая „Тэнча” таксама заспявала разам з арганістым не толькі песні папольску, ды найбольш чула выводзілі яны песню народжданую ў Машчонай-Панскай (адтуль родам Язэп Карпюк) — „Журавы”. Сямятыцкія зухаватыя „Швагры” пачалі ад „Чорных вочак як дэрэнь”, не забыўшыся пра „ладнэго бялоруса”. Ансамбль, які зайграў ноччу (нанялі яго ўсёй вёскай з Сямятыч) паўтарыў усе гіты „Падляшскага канцэрта пажаданняў” Радыё Рацыя ды самыя папулярныя дыска-польныя шлягеры. А найбольш усім падабалася балканская спольшчаная „Żono moja”.

Наступны Дзень Жэрчыч ужо будзе ўведзены ў планы гмінных мерапрыемстваў наступнага года. А пані Надзея Карчэўская раздумвае, ці не заснаваць вясковай культурна-грамадскай арганізацыі на ўзор Згуртавання вёска Залукі над Супраслю. Закалегавалі яны з Гарадоччынай і праз пару дзён „Незабудкі” выступілі ў Гарадку, у пенсіянераў. Ды якія яны пенсіянеры?! Дай Божа нам усім столькі энергіі, запалу і веры!

ISSN 0546-1960